ЧЫМ УНІКАЛЬНЫ КІНАЛАГІЧНЫ ЦЭНТР УЗБРОЕНЫХ СІЛ? 4-5

ВЫНІКІ ФЕСТЫВАЛЮ «ЛІСТАПАД» 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

25 ЛІСТАПАДА 2023 г. СУБОТА № 229 (30109)

Прадчуванне палёту

Фота БелТА.

У расійскім Цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў імя Гагарына праходзяць трэніроўку беларускія дзяўчаты, адна з якіх у хуткім часе адправіцца ў палёт. На здымку: касманаўт Марына ВАСІЛЕЎСКАЯ падчас трэніроўкі.

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар СЕРГЕЕНКА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта:

«У нашых маладых людзей не заўсёды ёсць разуменне, што ўсяго ў жыцці трэба дабівацца сваёй працай. Модна сёння казаць пра сацыяльныя ліфты, але я больш разумею і аддаю перавагу сацыяльнай лесвіцы. Калі чалавек ідзе па гэтай лесвіцы і сам дабіваецца ўсяго. Што датычыцца замацавання маладых спецыялістаў на месцах, мы ўсё больш гаворым пра матэрыяльныя стымулы — зарплата і гэтак далей, але мы ўлічваем маральныя стымулы, калі чалавек недзе служыць і адчувае сувязь не толькі з бацькамі, блізкімі, але і з арганізацыяй, дзе ён працуе».

КАРОТКА

- **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 24 лістапада Указ нумар 373, у адпаведнасці з якім змяняюцца ўмовы кіравання сродкамі сямейнага капіталу, прадугледжаныя Указам нумар 572.**
- Прадоўжана магчымасць бяспошліннага ўвозу электрамабіляў у Беларусь, Арменію, Казахстан і Кыргызстан.
- **Першае пасяджэнне Камісіі па правах чалавека СНД пройдзе 29 лістапада ў Мінску.**
- Беларусь займае першае месца сярод краін — імпарцёраў харчовай прадукцыі ў Расіі.
- **Зімовую падкормку дзікіх жывёл пачалі ў Белавежскай пушчы.**
- Сёлета ў Беларусі адрамантуюць не менш як 3 тысячы кіламетраў дарог.

Фінансавая бяспека

Не «наКЛІКаць» бы бяды

Прынамсі, на свае зберажэнні

Спытайцеся сябе: колькі разоў на дзень вы чуеце ці бачыце папярэджанні аб тэлефонных або інтэрнэт-махлярах? А колькі разоў вы казалі: «Ну як так проста аддаць свае грошы? Я ніколі б не павёўся на такі прымітыўны развод!» Магчыма і так, але статыстыка няўмольная, і яна сведчыць: ахвярай можа стаць хто заўгодна. Дастаткова толькі аднаго неасцярожнага «кліку» па спасылцы.

Сапраўды, нягледзячы на намаганні праваахоўных органаў і службаў бяспекі банкаў, справа фінансавага махлярства, асабліва ў сеціве, жывей за ўсіх жывых. Толькі ўявіце, сёлета ўстановы аднаго толькі Беларусбанка правялі больш за тры з паловай тысячы мерапрыемстваў, накіраваных на прафілактыку кіберзлачыннасці. Прычым ільвіная доля прафілактыкі прыпала не на школьнікаў, моладзь і пенсіянераў, а на дарослых, людзей сярэдняга ўзросту — 70 % захадаў датычыліся менавіта іх. Аб чым гэта сведчыць? Толькі аб тым, што залішняя ўпэўненасць у асабістай бяспецы можа выйсці бокам. Сучасныя махляры вельмі вынаходлівыя, а галоўнае — яны хутка мяняюць свае схемы падману. Сёння прапануем вам агляд найбольш распаўсюджаны (і не толькі) махінацый, бо хто інфармаваны — той абаронены.

СТАР. 3

Памяць

ДАКРАНУЦЦА ДА СКЛАДАНЫХ СТАРОНАК ГІСТОРЫІ ПРАЗ ФАКТЫ

Генеральная пракуратура і Міністэрства адукацыі прэзентавалі дапаможнік, прысвечаны генацыду беларускага народа

«Дзеці вайны... Як склалася наша дзяцінства? Ва ўсіх па-рознаму, але ў большасці яно было цяжкім. Асабліва ў яўрэйскіх дзяцей. Калі пачалася вайна, мне было амаль пяць гадоў. Мы жылі ў беларускім мястэчку. Я не памятаю тваіх бабулі і дзядулі (іх немцы расстралялі). А маці, старэйшая сястра і я збеглі за дзень да расстрэлу... Хоць было вельмі цёпла, на нас адзелі футра. Я ўзяла любімую ляльку, і мы пайшлі ў лес... Часта адпачывалі, бо я хварэла на коклюш. Зусім абяссілеўшы, пакінула ляльку на пяньку, каб пасля вайны яе забраць... Начавалі на могілках. Але свет не без добрых людзей. Нас прытуліла стогадовая бабуля. У 42-м годзе з'явіліся партызаны, сталі часта прыязджаць карнікі. Атрымаўшы папярэджванне ад разведкі аб іх з'яўленні, мы збягалі ў лес. Па лесе стралялі, свісцелі пулі, а мы хаваліся... Але дзеці ёсць дзеці. Прызвычаіліся да ўсяго: і да свісту пуль, і да трупаў...» — успамінала Зінаіда Гуліш.

СТАР. 7

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – СА СТАРЫМ СЯБРАМ!

Ідзе падпіска на I паўгоддзе 2024 года.

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2024 года, у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.

Інтэграцыя

Міжрэгіянальнае супрацоўніцтва Беларусі і Расіі не абмяжоўваецца форумам рэгіёнаў

На парадку дня — пастаяннае сумеснае інавацыйнае развіццё

Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі — падзея, якая праходзіць раз на год, але работа над задачамі і планамі, якія ён ставіць, ідзе круглы год. Прынамсі, як і супрацоўніцтва Беларусі і Расіі ў самых розных сферах. Міжрэгіянальнаму супрацоўніцтву нашых краін і форуму рэгіёнаў як яго сімвалу была прысвечана сустрэча Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай з намеснікам старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Юрыем ВАРАБ'ЁВЫМ.

Юрый Вараб'ёў — сустаршыня арганізацыйнага камітэта Форуму рэгіёнаў. Наталля Качанава падкрэсліла, што ў беларускага боку ёсць шэраг прапаноў наконт правядзення чарговага форуму. Самая значная з іх — правесці форум не ў адным горадзе, а ў двух, якія размешчаны побач. Спікер Савета Рэспублікі таксама падкрэсліла, што Форум рэгіёнаў будзе праходзіць два дні. Першы дзень плануецца прысвяціць рабоце секцый, другі — пленарнаму пасяджэнню. «Віцебск прапануецца для правядзення пленарнага пасяджэння, выставак, канцэртнай праграмы, горада майстроў, які можна будзе шырокамаштабна разгарнуць. У Віцебску гэта будзе зроблена вельмі добра, там штогод праходзіць «Славянскі базар» і ёсць досвед. Акрамя таго, нашы мерапрыемствы будуць праходзіць у дні «Славянскага базару». Але мы жадаем вам паказаць яшчэ Полацк. Гэта самы старажытны горад нашай краіны — упершыню згадваецца ў 862 годзе. Там ёсць шмат таго, што нас аб'ядноўвае. З Валянцінай Іванаўнай Матвіенка мы абмеркавалі тэматыку маючага адбыцца форуму і сышліся ў тым, што гэта павінна быць — сумеснае інавацыйнае развіццё нашых краін, рэалізацыя саюзных праграм, у прыватнасці імпартазамяшчэння, каб нам забяспечыць сёння сваю эканамічную бяспеку», — сказала Наталля Качанава.

Абмеркаванне вынікаў і перспектыў сумеснай работы працягнулася падчас Міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі і Савета Федэрацыі па міжрэгіянальным супрацоўніцтве. **Намеснік старшыні Савета Рэспублікі Валерый БЕЛЬСКІ** падчас пасяджэння заўважыў, што за дзевяць месяцаў бягучага года тавараабарот паміж Беларуссю і Расіяй склаў 35,5 мільярда долараў. Гэта амаль на 11 працэнтаў больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года, у якім узаемны гандаль таксама біў усе рэкорды. «Але гэта высокая планка не спыняе нашы ўрады і нашы прадпрыемствы, якія павялічваюць тавараабарот», — заўважыў ён. Таксама Валерый Бельскі звярнуў увагу, што працягваецца рэалізацыя інвестыцыйных праектаў на прамысловых прадпрыемствах Беларусі, у тым ліку за кошт крэдытных сродкаў Расійскай Федэрацыі. «Дзейнасць гэтых прадпрыемстваў арыентавана ў першую чаргу на выпуск імпартазамяшчальнай прадукцыі, якая будзе запатрабавана і ў Беларусі, і ў Расіі. У цэнтры ўвагі кіраўнікоў нашых дзяржаў і ўрадаў — далейшае развіццё кааперацыйных сувязяў і новых сумесных праектаў. Безумоўна, дастойны ўклад у агульную дынаміку ўносіць штогадовы Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі», — падкрэсліў ён.

Другое пытанне на парадку дня пасяджэння Міжпарламенцкай камісіі было звязана з фарміраваннем заканадаўства Беларусі і Расіі на прыкладзе мяккага падыходу да мадэльнага заканадаўства. «Мадэльныя законы ствараюцца не дзеля таго, каб іх у такім выглядзе прыняць. Гэта толькі вопыт, прапанова да фарміравання законаў Саюзнай дзяржавы. Таму важная тэма, мы абмеркавалі, як гэта лепш рабіць, як плануем гэтую працу, у якіх сферах нам трэба развіваць гэта супрацоўніцтва», — расказаў Юрый Вараб'ёў.

Актыўна абмяркоўвалася пытанне станкабудавання. Па словах Юрыя Вараб'ёва, на прыкладзе Ніжагародскай вобласці відаць, што рэгіёны паміж сабой развіваюць вельмі складаныя вытворчыя праекты, напрыклад, такія, як завод па будаўніцтве станкоў. «Гэта няпростае пытанне, але вельмі важнае для нашых дзяржаў. Мы ўбачылі, што некаторыя міждзяржаўныя праекты могуць быць рэалізаваны з дапамогай бюджэту Саюзнай дзяржавы, і тут ёсць перашкоды. Мы разгледзелі гэтыя перашкоды, мы ўнясём свае прапановы, як палепшыць выкарыстанне саюзнага бюджэту для сумесных навукова-тэхнічных распрацовак у агульных інтарэсах пры развіцці нашых прамысловых аб'ектаў», — адзначыў ён.

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ у размове з журналістамі падкрэсліў, што пасяджэнне Міжпарламенцкай камісіі — гэта свайго роду зверка гадзіннікаў па рэалізацыі дамоўленасцяў, якія абмяркоўваліся на форумах рэгіёнаў Беларусі і Расіі, рэалізацыі дагавораў аб супрацоўніцтве, якія былі заключаны. «Сёння, напрыклад, мы абмеркавалі дагаворы, якія былі заключаны паміж Гомельскай і Ніжагародскай абласцямі. Гэта адно з такіх канцэптуальных пытанняў, якое з'явілася сёння прадметам абмеркавання. Другое пытанне датычылася развіцця мадэльнай заканатворчасці інстытутаў мяккага права ў частцы збліжэння, уніфікацыі, гарманізацыі заканадаўстваў дзвюх краін», — сказаў ён. Сенатар назваў перспектыўным напрамак мадэльнай заканатворчасці ў частцы выпрацоўкі адзіных падыходаў да рэгулявання найбольш важных грамадскіх адносін у сферах, якія ўзаемна цікавыя для Беларусі і Расіі. У прыклад Сяргей Сівец прывёў мадэльны заканадаўчы акт «Аб сістэме абавязковага страхавання грамадзянскай адказнасці ўладальнікаў транспартных сродкаў Саюзнай дзяржавы». У распрацоўцы знаходзіцца праект мадэльнага закона аб прыгранічным супрацоўніцтве. «Таму сёння атрымалася дастаткова канструктыўная размова. Шмат карыснай інфармацыі атрымалі члены міжпарламенцкай камісіі. Гэта сустрэча стане яшчэ адной вяхой далейшага міжпарламенцкага супрацоўніцтва і развіцця нашых інтэграцыйных дамоўленасцяў», — дадаў Сяргей Сівец.

Валерыя СЦЯЦКО.

Выбары-2024

НА ВЫСОКІМ АРГАНІЗАЦЫЙНЫМ І ПРАВАВЫМ УЗРОЎНІ

Кіраўніцтва Цэнтральнай выбарчай камісіі сустрэлася з актывам палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў

На круглым стале былі патлумачаны навацыі выбарчага заканадаўства, асаблівасці правядзення выбараў дэпутатаў у адзіны дзень галасавання і выбараў дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу. Абмяркоўваўся ўдзел палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў у выбарчай кампаніі. Мерапрыемства стала працягам сустрэчы Прэзідэнта з кіраўнікамі палітычных партый, якая адбылася 10 лістапада ў Палацы Незалежнасці.

Адкрываючы круглы стол, **першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ** адзначыў, што ад кандыдатаў ад партый і грамадскіх аб'яднанняў чакаюць самага актыўнага ўдзелу ва ўсіх этапах выбарчага працэсу: ад вылучэння кандыдатаў да канкурэнцыі ў творчых ініцыятывах. Па яго словах, пажадана, каб у прадстаўнічыя органы ад гэтых суб'ектаў прыйшлі сапраўдныя прафесіяналы, людзі з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, якія добра разумеюць, чым жыве краіна і якія мэты ў нашай дзяржавы. «Таксама важна, каб у партый, якія прыйдуць на гэтыя выбары, былі прывабныя палітычныя праекты, актуальныя з пункту гледжання бягучага развіцця краіны, — дадаў Максім Рыжанкоў. — Наша агульная задача — не толькі паказаць прывабнасць тых ці іншых ідэй, але і садзейнічаць павышэнню прававой культуры грамадзян у адносінах выбарчага працэсу, увогуле папулярызацыі самой ідэі іх прыходу на выбарчыя ўчасткі, дзе можна будзе ўбачыць яркіх, цікавых людзей, з добрымі ідэямі».

Старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігар КАРПЕНКА звярнуў увагу на тое, што, у адпаведнасці са змяненнем канстытуцыйных норм, прынятых на рэспубліканскім рэферэндуме 27 лютага 2022 года, праводзіцца маштабная мадэрнізацыя палітычнай сістэмы. Па яго словах, завяршальным этапам гэтай работы будзе фарміраванне дэпутацкага корпуса ў адзіны дзень галасавання, а таксама выбары дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу і чарговыя выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якія павінны адбыцца не пазней за 20 ліпеня 2025 года.

Нагадаем, 20 лістапада Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 367, згодна з якім на 25 лютага 2024 года прызначаны выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь восьмага склікання і мясцовых Саветаў дэпутатаў дваццаць дзявятага склікання. «У адзіны дзень галасавання будуць выбірацца 110 дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і 12 514 дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, — паведаміў Ігар Карпенка. — Да выбараў будуць створаны 1394 акруговыя і тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі, каля 5,5 тысячы ўчастковых камісій. У рабоце камісій будзе задзейнічана каля 70 тысяч чалавек».

Старшыня Цэнтрвыбаркама заўважыў, што ўдзел у выбарах возьмуць і палітычныя партыі, а таксама грамадскія аб'яднанні. Яны надзелены паўнамоцтвамі вылучаць сваіх прадстаўнікоў у склады выбарчых камісій, накіроўваюць назіральнікаў, працаваць у складзе ініцыятыўных груп па зборы подпісаў грамадзян за вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты, праводзіць перадвыбарную агітацыю, масавыя мерапрыемствы, сустрэчы з выбаршчыкамі.

Ігар Карпенка нагадаў, што 4 сакавіка бягучага года ўступіла ў сілу абноўленая рэдакцыя Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Ён падкрэсліў, што змяненні прайшлі шырокае грамадскае абмеркаванне, адпавядаюць міжнародным стандартам, накіраваны на развіццё выбарчай сістэмы нашай краіны, дадуць магчымасць скараціць выбарчы цыкл і расходы на правядзенне выбарчых кампаній.

Кажучы аб ролі партый і грамадскіх аб'яднанняў у жыцці грамадства, у размове з журналістамі старшыня ЦВК адзначыў, што гэта будзе залежыць ад саміх партый і грамадскіх аб'яднанняў, ад таго, якую яны праграму прапануюць, як бачаць вырашэнне тых ці іншых праблем, што, дапусцім, ёсць у сацыяльна-эканамічным або палітычным развіцці. «Партыйная праграма павінна быць адаптавана да рэальных умоў жыццядзейнасці канкрэтнага рэгіёна, калі мы кажам аб выбранні дэпутатаў мясцовых Саветаў, — адзначыў Ігар Карпенка. — Калі мы кажам аб дэпутатах парламента, то тут трэба ўлічваць бачанне партыяй тых актуальных заканадаўчых актаў, якія павінны быць прыняты ў краіне. Беларусь не стаіць на месцы, мы развіваемся, у тым ліку і прававая сістэма, жыццё дыктуе шмат новых пытанняў. Нават у рэчышчы праведзенага рэферэндуму 2022 года каля 90 заканадаўчых актаў былі падвергнуты карэкціроўцы. З'явіліся новыя заканадаўчыя акты, такія як «Аб асновах грамадзянскай супольнасці», «Аб Усебеларускім народным сходзе».

Сур'ёзнае абнаўленне зведаў і Выбарчы кодэкс. «Гэта звязана не толькі з тымі рашэннямі рэферэндуму, якія былі прыняты ў 2022 годзе, — патлумачыў Ігар Карпенка. — Гэта яшчэ і тыя навацыі, якія былі вызначаны, зыходзячы з практыкі прымянення выбарчага заканадаўства. І тыя прабелы, якія ў нас былі ў рамках выбарчых кампаній, мы ўважліва прааналізавалі і пастараліся ліквідаваць у выбарчым заканадаўстве».

Па словах старшыні Беларускай партыі «Белая Русь», старшыні рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» Алега РАМАНАВА, правядзенне круглага стала карыснае тым, што да палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў была даведзена пазіцыя Цэнтрвыбаркама адносна нормаў заканадаўства, іх правільнай трактоўкі. «Для партый і грамадскіх аб'яднанняў гэта вельмі важна, бо мы накіраваны тое, каб працаваць выключна ў прававым полі і дзейнічаць на аснове выбарчага заканадаўства Рэспублікі Беларусь, — патлумачыў ён. — Другі сэнс гэтай сустрэчы — дэманстрацыя нашага адзінства і яго ўмацаванне. Прадстаўнікі палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў маглі абмеркаваць і пытанні ўзаемадзеяння ў ходзе выбарчай кампаніі, выпрацаваць шляхі сумеснага руху па дасягненні пастаўленых мэт. Думаю, што сустрэча будзе рэзультатыўнай яшчэ і ў гэтым плане».

Удзельнікі круглага стала абмяняліся меркаваннямі, задалі пытанні, якія іх цікавілі. Усё — з той мэтай, каб найбліжэйшая выбарчая кампанія прайшла на высокім арганізацыйным і прававым узроўні.

Вераніка КАНЮТА.

Не «наКЛІКаць» бы бяды

НЕ ВЕР СВАІМ ВУШАМ...

Трэба адзначыць, што абсалютна новых схем, па сутнасці, не так і многа. Асноўны алгарытм дзеянняў застаецца нязменным — мяняюцца акалічнасці і нюансы. Як адзначаюць супрацоўнікі банкаўскіх службаў бяспекі, ускладняюцца старыя спосабы падману, што павышае шанцы махляроў на поспех і не дазваляе аператыўна выкрыць і затрымаць злачынцаў.

Так, напрыклад, змяняецца частая, усім вядомая схема з «заблакіраванай» карткай (афармленнем крэдыту, падазронымі дзеяннямі ў асабістым кабінеце мабільнага або інтэрнэт-банкінга). Калі раней у месенджары проста тэлефанаваў нібыта супрацоўнік банка або праваахоўных органаў і спрабаваў выведаць дадзеныя банкаўскай карткі, то цяпер спачатку тэлефануе адзін з іх і загадзя «папярэджвае» пра тэлефонны званок ад праваахоўнікаў ці з банка. Такім чынам увага ахвяры аслабляецца, а давер да субяседніка ўзрастае. Больш за тое, злачынцы ўсё часцей выкарыстоўваюць праграмы для падмены тэлефонных нумароў, і вызначальнік вашага смартфона пакажа, што тэлефануюць менавіта з банка. А вынік гэткіх шматхадовак адзін — страчаныя грошы даверлівага кліента. Дарэчы, від махлярства з дапамогай тэлефоннай сувязі завецца вішынгам. Да яго ж адносяцца і паведамленні аб блізкіх, якія трапілі ў непрыемнасці або ў бальніцу.

...І ВАЧАМ

Яшчэ адзін распаўсюджаны спосаб падману — фішынг, сутнасць якога ў стварэнні ашуканцамі фальшывых інтэрнэт-старонак. Яны могуць імітаваць любыя афіцыйныя сайты: ад банкаўскіх да вядомых інтэрнэт-магазінаў ці службаў дастаўкі. Праз іх злачынцы атрымліваюць дадзеныя картак і скрадваюць з іх усе сродкі. У гэтую пастку лёгка трапляюць, напрыклад, як прадаўцы, так і пакупнікі сайтаў прыватных аб'яў, або карыстальнікі сацыяльных сетак, дзе часцяком анансуюцца «грандыёзныя распродажы астаткаў» нейкіх тавараў. І, канешне, абавязкова па перадаплаце. На жаль, не дапамагаюць тут шматлікія папярэджанні наконт асцярожных зносін у месенджарах, недапушчальнасці паведамлення CVV2 кода (лічбаў на адваротным баку карткі) каму-небудзь і тых жа пакупак па перадаплаце... Аднак, ёсць у арсенале махляроў і больш грозная зброя: шкодныя спасылкі ў электронных лістах, паведамленнях у сацсетках або SMS-паведамленнях. У гэтым выпадку вы можаце загрузіць на свой камп'ютар або смартфон вірусную праграму, якая прадаставіць зламысніку доступ да асабістага кабінета ў мабільным ці інтэрнэт-банкінгу. А гэта ўжо нашмат небяспечней.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«РАНІЦАЙ — ГРОШЫ, ВЕЧАРАМ — КРЭСЛЫ»

Калі вышэйназваныя спосабы даволі вядомыя, то некалькі наступных не настолькі відавочныя, але не менш шкодныя. Па-першае, звернем увагу на заўзятараў VPN-сэрвісаў. Здавалася б, што тут такога, наадварот — я абараняю сваю канфідэнцыяльнасць! Але не ўсё так проста. Справа ў тым, што ўсе дадзеныя, якія вы ўводзіце на камп'ютары ці смартфоне, па сутнасці становяцца бачнымі для трэціх асоб — распрацоўшчыкаў сэрвісу. Добра, калі тыя добрасумленныя, а калі не? Іх жа зараз столькі, што лічыць — не пералічыць. Да слова, спецыялісты па лічбавай бяспеці ўвогуле раяць не карыстацца нават бясплатнымі VPN, не гаворачы ўжо пра ўзламаныя дадаткі.

Наступная махінацыя тычыцца працаўладкавання. Дакладней — работы ў інтэрнэце: нядобрасумленныя «работадаўцы» абяцаюць высокія заробкі кандыдатам без адукацыі ці вопыту работы. А потым патрабуюць грашовыя ўнёскі, маўляў для страхоўкі або доступу да нейкіх заказаў. Ці, як у выпадках з «платнымі» апытаннямі і «выйгрышамі» ў латарэю, трэба ўнесці пэўную суму нібыта для вываду заробленых сродкаў. Зразумела, што ўнёсак гэты пойдзе ў кішэню ашуканца. Схема немудрагелістая, але... Чалавечае жаданне зарабіць многа і без якіх-небудзь значных намаганняў — раскошнае поле дзеяння для махляроў. Тут яны могуць таксама прапанаваць набыць каштоўныя паперы вядомых прадпрыемстваў, укласціся ў «перспектыўную» крыптавалюту...

Асобным радком стаяць тыя, хто падманвае людзей пад выглядам збору сродкаў на лячэнне дзяцей або родзічаў. Яны часцей за ўсё арудуюць у сацыяльных сетках і папросту падрабляюць існуючыя дабрачынныя зборы: бяруць сапраўдныя фатаграфіі ці аб'явы і мяняюць у іх рэквізіты плацяжкоў. Таму, перш чым зрабіць пералічэнне на дабрачынны рахунак, пашукайце ў інтэрнэце падобныя аб'явы і параўнайце рэквізіты. А лепш за ўсё — дапамагайце праз вядомыя і буйныя дабрачынныя фонды.

«МЯНЕ КРОЯЦЬ ТРЫВОЖНЫЯ СУМНЕННІ...»

І ўсё ж, якімі б выкрутлівымі ні былі жулікі, выявіць іх можна: у большасці схем яны выкарыстоўваюць адны і тыя ж прыёмы ўздзеяння на патэнцыяльных ахвяр. Дык што павінна вас насцярожыць?

Па-першае, тое, што вас паскорваюць, нават падганяюць, маўляў усё трэба зрабіць вельмі хутка, бо... А далей варыянтаў безліч: афармляць крэдыт на ваша імя, картка заблакіруецца разам з рахункам, не паспеем дапамагчы родзічу, раскупляць апошнія высокадаходныя акцыі і гэтак далей. Па-другое, у вас выпытваюць коды, патрабуюць зняць у банкамаце наяўныя грошы, а калі тэлефануе нібыта супрацоўнік праваахоўных органаў, то яшчэ і пагражаюць пакараннем за адмову супрацоўнічаць. Гэта што тычыцца вішынгу. У іншых выпадках звяртайце увагу, напрыклад, на розныя, здавалася б, дробязі: абяцанні высокіх заробкаў ці велізарных даходаў ад грашовых укладаў, гарантыі 100-працэнтнага прыбытку, прапановы папаўнення рахунку праз крыптавалюту, нават на наяўнасць «замочка» ў адрасным радку сайта і гэтак далей. Увогуле ж, трэба заўсёды памятаць адну простую ісціну: «Бясплатны сыр бывае толькі ў пастцы».

ЯК ЗАСЦЕРАГЧЫСЯ?

Спецыялісты дэпартамента бяспекі Беларусбанка даюць наступныя рэкамендацыі:

— нікому не паведамляйце рэквізіты банкаўскай карткі (нумар, тэрмін дзеяння, CVV2/CVC2 код, пароль 3D-Secure), логіны, паролі, дадзеныя карты кодаў, коды аўтарызацыі;

— заўсёды пераправерайце інфармацыю, якую атрымалі ад тэлефоннага субяседніка або ў паведамленнях у сацсетках і месенджарах. У падазроных ці незразумелых абставінах абавязкова патэлефануйце ў банк самастойна;

— не пераходзьце па незнаёмых спасылках, не адкрывайце ўкладанні ў электронных лістах ці паведамленнях у сацыяльных сетках;

— памятайце — банкі ніколі не запытваюць дадзеныя па тэлефоне, у месенджарах, праз рассылку SMS-паведамленняў, лістоў на электронную пошту;

— калі здымаеце наяўнасць у банкамаце, уважліва агледзьце яго на пабочныя прадметы;

— усталёвайце і рэгулярна абнаўляйце антывіруснае праграмнае забеспячэнне на камп'ютарах, планшэтах, смартфонах;

— захоўвайце лічбавую гігіену.

Уладзімір ВЯРЭНІЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Германіі 20 чалавек абвінавачваюцца ў планаванні дзяржпераваротy

Паліцыя Германіі правяла вобыскі ў васьмі федэральных землях па справе аб планах дзяржаўнага перавароту ў краіне, 20 чалавекам прад'яўлена абвінавачанне, паведаміла газета Bild. Пад кіраўніцтвам Генпракуратуры Мюнхена прайшліператрусы ў Баварыі, а таксама Гамбургу, Бадэн-Вюртэмбергу, Гесэне, Брандэнбургу, Ніжняй Саксоніі, Паўночным Рэйне — Вестфаліі і Шлезвігу-Гальштэйне. Як паведаміла Генеральная пракуратура Мюнхена і паліцэйскае ўпраўленне Верхняй Баварыі, абвінавачаныя (члены праваэкстрэмісцкага руху «Грамадзяне Рэйха») праз пагрозы і шантаж, выкарыстоўваючы сацыяльныя сеткі і мабільную сувязь, спрабавалі ўстанавіць кантакты з прадстаўнікамі ўлады, каб незаконна паўплываць на іх рашэнні. «Галоўнай мэтай дзейных асоб было дэстабілізаваць Федэратыўную Рэспубліку Германія, а таксама яе дзяржаўныя ўстановы», — заявілі ў Генпракуратуры Мюнхена. У канцы мінулага года Генпракуратура Германіі арыштавала больш за 20 чалавек па падазрэнні ва ўдзеле ў змове з мэтай захопу ўлады ў рэспубліцы. Служба абароны канстытуцыі краіны падлічыла, што летась колькасць «Грамадзян Рэйха» ў Германіі стала на 2 тысячы большай у параўнанні з мінулым годам і склала 23 тысячы чалавек.

Польскія перавозчыкі перакрылі пастаўку ва Украіну вайсковых грузаў

Польскія перавозчыкі на граніцы перакрылі пастаўку ва Украіну вайсковых грузаў і іншых крытычна важных тавараў, паведамляецца ў Telegram-канале інтэрнэт-газеты «Страна». «Паліва, беспілотнікі, цеплавізары, тавары медыцынскага прызначэння і гуманітарная дапамога не могуць быць дастаўлены ва Украіну з-за пратэстаў польскіх перавозчыкаў на кантрольна-прапускных пунктах», — паведамляецца ў сацсетцы. Таксама на граніцы «затрымаліся» камплектуючыя для дэтэктараў набліжэння беспілотнікаў «Ланцэт». Раней намеснік міністра інфраструктуры Украіны Сяргей Дзяркач заяўляў, што былі зафіксаваны шматлікія факты, калі цыстэрны з палівам і машыны з гуманітарнай дапамогай стаяць у чэргах. Ён адзначыў, што інфармацыя аб парушэннях была перададзена польскаму боку. Між тым Варшава адмаўляе абвінавачанні ў затрымцы грузаў.

Прававая дапамога

Тастаменты, спадчына, даверанасці

У Мінску абмеркавалі работу базавай арганізацыі СНД у сферы натарыяту

Абмен вопытам, перадавымі навінкамі ў сферы натарыяльнай дзейнасці, павышэнне кваліфікацыі натарыусаў. З гэтым мэтамі ў маі 2022 года была створана базавая арганізацыя дзяржаў — удзельніц СНД у сферы натарыяльнай дзейнасці, дзе кіруючым органам стала Беларуская натарыяльная палата (БНП). Днямі ў Мінску прайшло другое пасяджэнне арганізацыі, дзе падвялі дасягнутыя за гэты час вынікі работы і запланавалі задачы на будучыню. Сярод іх — стварэнне электроннага ўзаемадзеяння паміж натарыятамі, каб спрасціць дакументаабарот і больш аператыўна атрымліваць звесткі падчас аказання прававой дапамогі людзям. У натарыятах спадзяюцца, што гэта зможа адбыцца ўжо налета. На першае паўгоддзе 2024-га запланаваны, напрыклад, круглы стол, дзе спецыялісты абмяркуюць этапы лічбавізацыі натарыяльнай дзейнасці.

Даверaны трэці бок

Арганізацыя, якая працуе ўжо два гады, першая такая суполка юрыдычнага профілю на прасторах СНД. Сёння важна разумець, як яе стварэнне паўплывала на натарыяльныя практыкі краін, таму што за гэты час членамі натарыяльнай суполкі ў межах СНД сумесна праведзена шмат мерапрыемстваў і дасягнута нямала вынікаў, адзначыла **Наталля БАРЫСЕНКА, старшыня Беларускай натарыяльнай палаты (БНП):**

— Да ўдзелу ў мерапрыемствах прыцягваліся вучоныя, практыкуючыя юрысты, натарыусы неаднаразова ўдзельнічалі ў пасяджэннях рабочых груп Выканаўчага камітэта СНД. Зараз мы на парозе пераходу да электроннага абмену дакументамі як унутры натарыяльных суполак, так і ў прыватным прававым парадку. Іншымі словамі, мы хочам даць магчымасць грамадзянам, якія атрымалі натарыяльны акт у выглядзе электроннага дакумента, прад'явіць яго ў суседняй краіне без пераводу на папяровы носьбіт. Сёння гэтаму пакуль крыху перашкаджае адсутнасць існавання ў нашых краінах даверaных трэціх бакоў. Гэта арганізацыі, якія створаны ўжо ў некалькіх краінах і дазваляюць праверыць на сапраўднасць і цэласнасць электронны дакумент, створаны і абаронены ў адпаведнасці з заканадаўствам адной дзяржавы, і пацвердзіць, што ў гэты дакумент не ўносіліся змены і яго зместу можна давяраць. І гэта вельмі важна, калі мы працуем з дакументамі, якія пацвярджаюць пэўныя маёмасныя і немаёмасныя правы грамадзян.

Са з'яўленнем такой магчымасці для людзей будуць створаны камфортныя ўмовы, а натарыусы змогуць аператыўна амбеньвацца інфармацыяй. Гэта таксама паўплывае і на выніковы кошт дакумента, таму што скароціцца час на работу з ім і павысіцца якасць работы ў цэлым, удакладніла старшыня БНП.

Курс на электроннае ўзаемадзеянне

Асноўная задача базавай арганізацыі СНД у сферы натарыяльнай дзейнасці — умацаванне ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва і абмену вопытам натарыятаў, падкрэсліў **Мікалай СТАРАВОЙТАЎ, намеснік міністра юстыцыі Беларусі:**

— Нягледзячы на існаванне асаблівасцяў прававога рэгулявання пытанняў натарыяльнай дзейнасці ў краінах — удзельніцах СНД, паміж іх натарыятамі шмат агульнага. Хутчэй за ўсё таму, што ўсе яны выйшлі з Савецкага Саюза. І самая галоўная іх задача — забяспечыць абарону правоў і законных інтарэсаў грамадзян шляхам здзяйснення натарыяльных дзеянняў.

За два гады ў сферы натарыята было зроблена шмат работы. Гэта стажыроўкі, абмен практыкамі і вопытам краін, відэаканферэнцыі, семінары, вебінары. Вельмі цікавым, напрыклад, стаўся абмен натарыяльным вопытам у сферах аўтамототранспарту, электроннага апастылю і электроннага дакументаабароту, падзяліўся ўражаннямі **Дзілшод АШУРАЎ, старшыня натарыяльнай палаты Рэспублікі Узбекістан:**

— У найбліжэйшай будучыні мы плануем абменьвацца дакументамі паміж краінамі ў электронным варыянце. Гэта можа датычыцца, напрыклад, даверанасцяў на здзяйсненне здзелак прадстаўніком арганізацыі на месцы (за мяжой). Сёння мы можам праверыць, ці адменена даверанасць, ці існуе тастамент, або ці адкрыта спадчынная справа ў краінах — удзельніцах базавай арганізацыі.

Найбольш і найперш важныя і рэальныя для ажыццяўлення ў сферы электроннага ўзаемадзеяння паміж краінамі СНД, на думку старшыні натарыята Узбекістана, задачы спадчынных спраў, праверкі даверанасцяў і тастаментаў:

— Гэта тое, што мы павінны бачыць у электронным фармаце і што сёння магчыма зрабіць. У далейшым, калі гэта будзе магчыма заканадаўча, можна будзе разглядаць і іншыя натарыяльныя дзеянні.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

Унікальнае падраздзяленне

Андрэй БАРДУКОЎ:

«ЯК БЫ НІ РАЗВІВАЛАСЯ ТЭХНІКА, НЕДААЦЭНЬВАЦЬ МАГЧЫМАСЦІ ЧАТЫРОХЛАПЫХ БАЙЦОЎ НЕ ВАРТА»

Кіналагічны цэнтр Узброеных Сіл адзначыў 30-гадовы юбілей

За ўсю гісторыю свайго існавання ўнікальная воінская часць падрыхтавала не менш як 3,5 тысячы спецыялістаў службовага сабакаводства. Прыкладна столькі ж — службовых сабак. Чатырохлапыя байцы спецыялізуюцца на караульнай, патрульнай, мінна-вышуковай, пошукава-ратавальнай і вышуковай дзейнасці. Знайсці зброю, наркотыкі або выбуховае рэчыва для службовага сабакі — задача без зорачкі.

За гэтымі ўнікальнымі здольнасцямі, якія дэманструюць чатырохлапыя выхаванцы кіналагічнага цэнтра, — штодзённая карпатлівая праца калектыву прафесіяналаў. З першага дня пасля нараджэння маленькія істоты трапляюць у надзейныя рукі, якія клапоцяцца аб іх як маці аб сваіх дзецях і вядуць па жыцці. Маладыя людзі, што праходзяць тэрміновую службу ў кіналагічным цэнтры, знаходзяць тут верных сяброў. Без сабак, побач з якімі праслужылі год ці паўтара, яны не ўяўляюць свайго жыцця, а таму застаюцца, з цягам часу папаўняючы афіцэрскія шэрагі краіны.

«Сабака і кінолаг — гэта тандэм, экіпаж: яны адзін аднаго адчуваюць і разумеюць», — кажа **начальнік кіналагічнага цэнтра Узброеных Сіл палкоўнік Андрэй БАРДУКОЎ.** Гэтай унікальнай воінскай часцю ён кіруе на працягу амаль сямі гадоў. Увогуле ў кіналагічным цэнтры з 2002 года. Праходзіў службу на розных пасадах: пачынаў намеснікам камандзіра вучэбнай роты, затым быў яе камандзірам, пасля — старшым афіцэрам штаба, намеснікам начальніка цэнтра па ідэалагічнай рабоце, пасля чаго ўзначаліў воінскае падраздзяленне.

На вачах Андрэя Бардукова радавыя станавіліся афіцэрамі, разам са сваімі гадаванцамі ваеннаслужачыя дасягалі высокіх поспехаў на міжнароднай арэне, у цэлым развівалася і ўдасканальвалася айчынная ваенная кіналагічная школа. Аб асноўных дасягненнях цэнтра, а таксама тонкасцях службы ў тандэме і пагутарылі з нагоды юбілею.

— Андрэй Юр'евіч, мала хто ведае, што кіналагічны цэнтр Узброеных Сіл ствараўся з мэтай узмацнення аховы ваенных аб'ектаў. Мяркую, што за тры дзесяцігоддзі спектр задач у воінскага падраздзялення істотна пашырыўся...

— За апошнія пяць-сем гадоў мы значна ступілі наперад. Калі раней мы рыхтавалі сабак выключна для аховы ваенных аб'ектаў, то цяпер нашы ваеннаслужачыя разам са сваімі чатырохлапымі сябрамі ўдзельнічаюць ва ўсіх мерапрыемствах, якія праводзяцца ва Узброеных Сілах. Адпрацоўваем задачы па ахове месцаў дыслакацыі войскаў, забеспячэнні дысцыпліны і правапарадку ў падраздзяленнях, патруляванні, выстаўленні на пастах, выяўленні выбуховых рэчываў і інш. Не так даўно, напрыклад, прымалі ўдзел у вучэннях на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі. Улічваючы тое, што адбываецца навокал, нам гэты вопыт патрэбны. Акрамя таго нашы кінолагі разам са сваімі гадаванцамі сумесна з ваеннаслужачымі ваенных камендатур ажыццяўляюць мерапрыемствы па прафілактыцы нарказлачынстваў сярод вайскоўцаў. Аднак асноўная наша задача — падрыхтоўка спецыялістаў і службовых сабак па шматлікіх відах службы.

— Апошнім часам у кіналагічным цэнтры Узброеных Сіл часцей можна назіраць школьнікаў...

— Удзел у ваенна-патрыятычным выхаванні моладзі з'яўляецца яшчэ адным немалаважным кірункам нашай дзейнасці. Дзеці прыходзяць да нас, а мы, у сваю чаргу, наведваем дзіцячыя сады, школы, а таксама ўстановы сярэдне-спецыяльнай і вышэйшай адукацыі. Ва Узброеных Сілах створана цэлая сістэма, калі воінскія часці замацаваны за пэўнымі адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі. Кіналагічны цэнтр супрацоўнічае з навучальнымі ўстановамі Фрунзенскага раёна сталіцы. Гісторыя і тое, што адбываецца ў свеце, паказваюць, што пытанню ваенна-патрыятычнага выхавання варта ўдзяляць вялікую ўвагу. Без гэтага будучыні ў краіне не будзе, або яна будзе такой, як мы бачым у суседніх краінах. Малады чалавек павінен ведаць гісторыю сваёй дзяржавы, любіць сваю Радзіму, разумець, для чаго патрэбна армія, што мы заўсёды гатовы абараніць сваю краіну, калі гэтага запатрабуе абстаноўка.

— На што звяртаеце ўвагу падчас адбору ваеннаслужачых?

— Вітаецца, калі ў маладых людзей ёсць ветэрынарная адукацыя. Аднак гэта больш пра медыцыну. Кіналогія — найперш работа з сабакам, яго дрэсіроўка, абслугоўванне. Аднак факультэтаў, дзе б навучалі кіналагічнай службе, у нас няма. Пэўныя кірункі ёсць у навучальных установах Расійскай Федэрацыі. Мы ж рыхтуем кадры ў сябе. Прызываючы маладых людзей на тэрміновую ваенную службу, звяртаем увагу на вопыт работы з сабакамі. У многіх ёсць хатні гадаванец, часта са сваім сабакам малады чалавек удзельнічае ў клубе службовага сабакаводства. Практычна ў кожным горадзе ёсць нашы паплечнікі. Трэці, абавязковы, крытэрый паступлення да нас на службу — маладыя людзі павінны любіць сабак, не баяцца іх.

— Ці застаюцца ў кіналагічным цэнтры пасля праходжання тэрміновай ваеннай службы?

— Шмат хто застаецца, дасягае прафесійных вышынь. Прыходзяць да нас салдатамі, становяцца афіцэрамі. Напрыклад, мой намеснік, падпалкоўнік Валерый Рык, у свой час прыйшоў сюды для праходжання тэрміновай службы. Акрамя таго, ваеннаслужачыя кіналагічнага цэнтра карыстаюцца попытам у іншых сілавых ведамствах. Наша школа, падрыхтоўка і базавыя навыкі, якія мы закладваем, запатрабаваны ў многіх сферах нацыянальнай службы. — Урачам-педыятрам і то прасцей: неабходную інфармацыю можна спытаць у маці ці бацькі. Сабака ж не скажа: з'еў ён атручаную мыш або ланцужок. Гаспадар не ўсё можа дагледзець».

На тэрыторыі кіналагічнага цэнтра функцыянуе ветэрынарная служба. Лячэнне і рэабілітацыю тут праходзяць сабакі з усіх воінскіх часцей Беларусі — свайго роду галоўны ваенны шпіталь для чатырохлапых байцоў. Без перабольшання тут ратуюць жыцці і вяртаюць службовых сабак у строй.

На працягу многіх гадоў ветэрынарную службу кіналагічнага цэнтра ўзначальвае **капітан Міхаіл БАРАН.** Ён — старэйшына воінскага падраздзялення. У 1996 годзе прыйшоў сюды салдатам тэрміновай службы. За 27 гадоў практычнай дзейнасці Міхаіл Анатольевіч бачыць сваіх пацыентаў наскрозь: з ходу можа паставіць дыягназ, арыентуючыся выключна на клінічныя прыкметы. І толькі для таго, каб яго пацвердзіць, праводзяцца дадатковыя маніпуляцыі.

«У сабак адзін мінус — яны не ўмеюць размаўляць, — кажа начальнік ветэрынарнай службы. — Урачам-педыятрам і то прасцей: неабходную інфармацыю можна спытаць у маці ці бацькі. Сабака ж не скажа: з'еў ён атручаную мыш або ланцужок. Гаспадар не ўсё можа дагледзець».

Матэрыяльна-тэхнічная база ветэрынарнай службы дазваляе праводзіць усе неабходныя аперацыі, дыягнастычныя і лабараторныя даследаванні, ажыццяўляць стацыянарнае лячэнне жывёл. У ветлазарэце, разлічаным на дзесяць месцаў, можна ўтрымліваць праперыраванага або хворага сабаку столькі, колькі гэта неабходна. Вялікая ўвага ўдзяляецца прафілактыцы захворванняў у сабак. З гэтай мэтай праводзіцца рэгулярная дыспансерызацыя. Давяраюць айбалітам у пагонах і цывільныя грамадзяне. Медыцынская дапамога аказваецца іх гадаванцам на платнай аснове.

Аказваецца, хварэюць сабакі так, як і людзі. Апошнім часам пачасціліся выпадкі анкалогіі. Для службовых сабак прафесійнымі захворваннямі з'яўляюцца траўмы.

Як многія людзі баяцца наведваць урачоў, так і сабакі — ветэрынараў. «Дзякуючы свайму нюху яны адчуваюць нас за кіламетр, — заўважае Міхаіл Баран. — Як толькі мы заходзім на тэрыторыю вальераў, у іх пачынаецца паніка. Дрыжаць, калі прыходзяць да нас, у ветэрынарную службу».

Па словах начальніка, давяраць сабаку нельга. «Ён цябе можа ўкусіць не са злосці, а з жывёльнага страху, — тлумачыць капітан. — Нават самы добры сабака ў стрэсавай сітуацыі можа паводзіць сябе агрэсіўна. Да кожнай жывёлы трэба знайсці падыход. Аднак не да ўсіх атрымліваецца. У такім выпадку трэба хутчэй рабіць усё неабходнае. Некаторых пагладзіш — і яны супакойваюцца».

Адным з падраздзяленняў кіналагічнага цэнтра з'яўляецца гадавальнік. Тут маленькія камячкі з'яўляюцца на свет — для гэтага створаны ўсе неабходныя ўмовы. Цяпер у гадавальніку падрастае 12 шчанят. Племянная работа заключаецца не толькі ў павелічэнні пагалоўя службовых сабак, а і ў паляпшэнні працоўных якасцяў чатырохлапых.

— Сабакі з'яўляюцца на свет у радзільным аддзяленні, — расказвае **начальнік гадавальніка кіналагічнага цэнтра Узброеных Сіл старшы прапаршчык Валерый ЕЎТУХОВІЧ.** — На працягу двух месяцаў за імі тут назіраюць, даглядаюць, прывіваюць базавыя навыкі. Праз паўгода сабак перадаюць у падраздзяленне, дзе пачынаецца навучальны працэс. У выніку вырастаюць службовыя сабакі, якія выконваюць задачы па прызначэнні.

Дарэчы, з мамай шчанюкоў раздзяляюць, калі ім спаўняецца па месяцы. У іх прарэзваюцца зубкі, і маме ўжо балюча карміць малых. З месяца пачынаецца прыкорм, шчанят пераводзяць на корм. На гэтым этапе адбываецца адбор: кінолагі выбіраюць сабе чатырохлапых напарнікаў.

Як і многія, у кіналагічны цэнтр Валерый Еўтуховіч трапіў на тэрміновую ваенную службу. Уцягнуўся, а таму застаўся на кантракце. За 14 гадоў службы ніколі не пашкадаваў аб сваім рашэнні. Падчас службы Валерый завочна скончыў Віцебскую дзяржаўную акадэмію ветэрынарнай медыцыны. «Вельмі люблю сабак, з дзяцінства імі займаюся, — кажа начальнік гадавальніка. — З чатырохлапымі не засумуеш: яны заўсёды табе рады, што б не адбылося. Сабакі вельмі добра адчуваюць чалавека».

За Валерыем таксама замацаваны службовы сабака па мянушцы Бура на Марсе. Мянушку, дарэчы, прыдумаў сам: па яго словах, яна поўнасцю адлюстроўвае характар сабакі. Ёсць чатырохлапыя сябры ў старшага прапаршчыка і дома — нямецкая аўчарка, мопс, французскі бульдог, даберман і кошка. Кажа, што ўсе паміж сабой сябруюць.

Мянушку гадаванцы павінны атрымаць да месячнага ўзросту. У шчанюкоў з аднаго памёту імёны будуць на адну літару — такое правіла. Мянушка павінна падыходзіць па характары, адпавядаць знешнасці сабакі. Гэта толькі на першы погляд здаецца, што іх можна пераблытаць. «Калі кожны дзень праводзіш разам, бачыш, што сабакі адрозніваюцца адзін ад аднаго, — кажа Валерый Еўтуховіч. — У кагосьці лапка больш светлая, у кагосьці — адметная пляма на грудзі. Зусім аднолькавых сабак, як і людзей, не бывае».

Пасля таго, як сабакі падрастаюць, іх пачынаюць рыхтаваць да службы. Пачынаюць з 2016 года, удзельнічаем у Міжнародных армейскіх гульнях. Конкурс, у якім спаборнічаюць кінолагі, называецца «Верны сябар» — гэта свайго роду біятлон, толькі бегчы трэба з сабакам. Наша каманда заўсёды на п'едэстале. Тройчы мы былі другімі, чатыры разы станавіліся бронзавымі прызёрамі. Ёсць да чаго імкнуцца. Прынята называюць «біятлонам з сабакамі». У свой час ездзілі ў Бельгію, Чэхію, Францыю, Галандыю, заўсёды займалі прызавыя месцы. Тройчы станавіліся чэмпіёнамі. Пачынаючы з 2016 года, удзельнічаем у Міжнародных армейскіх гульнях. Конкурс, у якім спаборнічаюць кінолагі, называецца «Верны сябар» — гэта свайго роду біятлон, толькі бегчы трэба з сабакам. Наша каманда заўсёды на п'едэстале. Тройчы мы былі другімі, чатыры разы станавіліся бронзавымі прызёрамі. Ёсць да чаго імкнуцца. Прынята

Акрамя таго, ваеннаслужачыя кіналагічнага цэнтра карыстаюцца попытам у іншых сілавых ведамствах. Наша школа, падрыхтоўка і базавыя навыкі, якія мы закладваем, запатрабаваны ў многіх сферах нацыянальнай службы. — Урачам-педыятрам і то прасцей: неабходную інфармацыю можна спытаць у маці ці бацькі. Сабака ж не скажа: з'еў ён атручаную мыш або ланцужок. Гаспадар не ўсё можа дагледзець».

Матэрыяльна-тэхнічная база ветэрынарнай службы дазваляе праводзіць усе неабходныя аперацыі, дыягнастычныя і лабараторныя даследаванні, ажыццяўляць стацыянарнае лячэнне жывёл. У ветлазарэце, разлічаным на дзесяць месцаў, можна ўтрымліваць праперыраванага або хворага сабаку столькі, колькі гэта неабходна. Вялікая ўвага ўдзяляецца прафілактыцы захворванняў у сабак. З гэтай мэтай праводзіцца рэгулярная дыспансерызацыя. Давяраюць айбалітам у пагонах і цывільныя грамадзяне. Медыцынская дапамога аказваецца іх гадаванцам на платнай аснове.

Аказваецца, хварэюць сабакі так, як і людзі. Апошнім часам пачасціліся выпадкі анкалогіі. Для службовых сабак прафесійнымі захворваннямі з'яўляюцца траўмы.

Як многія людзі баяцца наведваць урачоў, так і сабакі — ветэрынараў. «Дзякуючы свайму нюху яны адчуваюць нас за кіламетр, — заўважае Міхаіл Баран. — Як толькі мы заходзім на тэрыторыю вальераў, у іх пачынаецца паніка. Дрыжаць, калі прыходзяць да нас, у ветэрынарную службу».

Па словах начальніка, давяраць сабаку нельга. «Ён цябе можа ўкусіць не са злосці, а з жывёльнага страху, — тлумачыць капітан. — Нават самы добры сабака ў стрэсавай сітуацыі можа паводзіць сябе агрэсіўна. Да кожнай жывёлы трэба знайсці падыход. Аднак не да ўсіх атрымліваецца. У такім выпадку трэба хутчэй рабіць усё неабходнае. Некаторых пагладзіш — і яны супакойваюцца».

Адным з падраздзяленняў кіналагічнага цэнтра з'яўляецца гадавальнік. Тут маленькія камячкі з'яўляюцца на свет — для гэтага створаны ўсе неабходныя ўмовы. Цяпер у гадавальніку падрастае 12 шчанят. Племянная работа заключаецца не толькі ў павелічэнні пагалоўя службовых сабак, а і ў паляпшэнні працоўных якасцяў чатырохлапых.

— Сабакі з'яўляюцца на свет у радзільным аддзяленні, — расказвае **начальнік гадавальніка кіналагічнага цэнтра Узброеных Сіл старшы прапаршчык Валерый ЕЎТУХОВІЧ.** — На працягу двух месяцаў за імі тут назіраюць, даглядаюць, прывіваюць базавыя навыкі. Праз паўгода сабак перадаюць у падраздзяленне, дзе пачынаецца навучальны працэс. У выніку вырастаюць службовыя сабакі, якія выконваюць задачы па прызначэнні.

Дарэчы, з мамай шчанюкоў раздзяляюць, калі ім спаўняецца па месяцы. У іх прарэзваюцца зубкі, і маме ўжо балюча карміць малых. З месяца пачынаецца прыкорм, шчанят пераводзяць на корм. На гэтым этапе адбываецца адбор: кінолагі выбіраюць сабе чатырохлапых напарнікаў.

Як і многія, у кіналагічны цэнтр Валерый Еўтуховіч трапіў на тэрміновую ваенную службу. Уцягнуўся, а таму застаўся на кантракце. За 14 гадоў службы ніколі не пашкадаваў аб сваім рашэнні. Падчас службы Валерый завочна скончыў Віцебскую дзяржаўную акадэмію ветэрынарнай медыцыны. «Вельмі люблю сабак, з дзяцінства імі займаюся, — кажа начальнік гадавальніка. — З чатырохлапымі не засумуеш: яны заўсёды табе рады, што б не адбылося. Сабакі вельмі добра адчуваюць чалавека».

За Валерыем таксама замацаваны службовы сабака па мянушцы Бура на Марсе. Мянушку, дарэчы, прыдумаў сам: па яго словах, яна поўнасцю адлюстроўвае характар сабакі. Ёсць чатырохлапыя сябры ў старшага прапаршчыка і дома — нямецкая аўчарка, мопс, французскі бульдог, даберман і кошка. Кажа, што ўсе паміж сабой сябруюць.

Народны музей «Дзеці вайны» сталічнай сярэдняй школы № 137 імя П. М. Машэрава — яскравы ўзор таго, як можна працаваць па захаванні гістарычнай памяці. Хоць яго кіраўнік, **настаўнік гісторыі Людміла ШЧЭННІКАВА**, канстатуе: да сённяшняй моладзі дастукацца вельмі складана, але можна. Гісторыя ажывае для іх праз гісторыі жывых людзей, плюс-мінус равеснікаў яе вучняў. Напрыклад, праз гісторыю хлопчыка, якога ў лагеры прымушалі іграць творы Брамса на скрыпцы. Ад усіх вязняў, якія праходзілі мімо, фашыст патрабаваў назваць імя нямецкага кампазітара, а калі адказ быў няправільны, ён страляў у чалавека. Так побач з юным музыкантам аказалася шмат цел забітых. Пасля гэтага ён ужо ніколі не змог узяць музычны інструмент у рукі. Такія гісторыі не пакідаюць дзяцей абыякавымі.

Самі вучні падказалі настаўніцы новую форму работы: яны малююць тое, што адчуваюць і што складана перадаць на словах. Дзякуючы кантактам з былымі вязнямі, дзеці, якія запісваюць іх успаміны, растуць чулымі да чалавечай трагедыі. Адзін з раздзелаў музея называецца «Не старэюць душой»: у ім распавядаюць пра пасляваеннае жыццё былых вязняў канцлагераў. Кожны год у школе пішуцца даследчыя работы, прысвечаныя трагічным падзеям Вялікай Айчыннай вайны, людзям, якія прайшлі праз гэтае пекла, навучэнцы звяртаюцца ў музеі і архівы...

У 2004 годзе на базе 137-й школы быў створаны хор «Лёсы», у якім удзельнічалі валанцёры навучальнай установы і малалетнія вязні. За значныя дасягненні ў захаванні памяці пра Вялікую Айчынную вайну і патрыятычнае выхаванне моладзі Указам Прэзідэнта яму было прысуджана прэмія «За духоўнае адраджэнне».

Свае кнігі «Палессе. Трагедыя і памяць» і «Трагедыя Палесся. Малавядомыя старонкі вайны 1941—1945 гадоў», напісаныя ў суаўтарстве, прэзентаваў у музеі «Дзеці вайны» Аркадзь Шкуран, былы малалетні вязень канцлагера «Азарычы».

Бліжайшым часам фонды музея папоўняцца ўнікальнымі дакументальнымі матэрыяламі якія збіраў Уладзімір Васільевіч Карпухін, заснавальнік Магілёўскага абласнога фонда пацярпелых ад нацызму. Сабраны ім архіў налічвае 5 тысяч лістоў успамінаў вязняў канцэнтрацыйных лагераў і тых, хто ўдзельнічаў у прымусовых работах у Германіі. Гэтай інфармацыяй ён падзяліўся з членамі Савета музея «Дзеці вайны», а музей атрымаў новыя экспанаты...

Надзея НІКАЛАЕВА, фота аўтара.

Сёлетні XXIX Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад» цяпер ужо набыў новыя старонкі сваёй гісторыі. І там не толькі паказы цікавых кінастужак, але і шэраг важных сустрэч, майстар-класаў і адметныя крокі ў далейшым супрацоўніцтве па кінавытворчасці. У дзень закрыцця фестывалю прадстаўнікі Міністэрства культуры, нацыянальнай кінастудыі, госці кінафоруму сабраліся ў Доме прэсы, каб агучыць папярэднія вынікі і бачанне яго далейшага існавання.

МІНСКІ МІЖНАРОДНЫ КІНА ФЕСТЫВАЛЬ ЛІСТАПАД

Кіно, якое ствараецца тут і намі

НОВАЕ ГУЧАННЕ ЦІ ВЯРТАННЕ ДА ВЫТОКАЎ?

— Для мяне гэты фестываль стаў экзаменам, дзе я першы раз быў дырэктарам, кіраваў падрыхтоўкай кінафоруму, прымаў гасцей і рашэнні. Галоўнае, што мы змаглі пашырыць геаграфію нашага «Лістапада», у якім удзельнічала на гэты раз 107 краін. Я ганаруся, што наша краіна праз гэты фестываль выйшла на такі салідны ўзровень. Упэўнены, увесь свет назірае, як у нас праходзяць конкурсы, мерапрыемствы, і атрымлівае ад убачанага задавальненне, — адзначыў **генеральны дырэктар кінастудыі «Беларусьфільм» Юрый АЛЯКСЕЙ.** — Таксама на гэтым кінафестывалі мы правялі шэраг перагавораў, і падпісаны пагадненні аб супрацоўніцтве з кітайскімі калегамі, што для нас вельмі важна. Таксама падпісана пагадненне з Ігарам Угольнікавым аб вытворчасці фільма, які распавядзе яшчэ адну гісторыю пра беларускіх партызан. Дасягнуты дамоўленасці з нашымі партнёрамі з «Татарстанфільма», будзем сумесна працаваць у наступным годзе. З «Лендок» мы ўваходзім у міжнародны праект, дзе таксама ўдзельнічаюць Казахстан, Узбекістан. Шмат падзей было. І я ганаруся, што беларускім фільмам мы адкрылі сёлетні «Лістапад».

— Мы не проста падпісалі дагавор аб будучай рабоце з «Беларусьфільмам» — фільме «Бацька Мінай. Партызанская легенда», мы сумеснымі сіламі пачнём здымаць яго летам наступнага года. Спадзяёмся, што да 80-годдзя Вялікай Перамогі зможам яго прадставіць не толькі Расіі і Беларусі, але і ўсяму свету, — падзяліўся **кінарэжысёр, народны артыст Расіі Ігар УГОЛЬНІКАЎ.** — Я бачыў многія фестывалі «Лістапад» і вельмі рады таму, што яго кірунак, заяўлены ў слогане ў самым пачатку — «За гуманізм кінамастацтва, за мір і сяброўства паміж народамі», не змяніўся, і ён вельмі пасуе Мінску асабліва цяпер. Думаю, што фестываль «Лістапад» у наступным годзе па-сапраўднаму верне сабе той складнік, які ён заўсёды меў. Ёсць вельмі важная пазіцыя ў цэнтральнага кінафестывалю краіны — гэта яго візітка, яго ідэалогія. І якраз у сённяшняй сітуацыі патрэбна дэманстраваць адкрытасць Беларусі, яе ўменне даваць упэўненасць у заўтрашнім дні.

На фестывалі не толькі дэманстравалі ў кінатэатрах сталіцы і рэгіёнаў фільмы, але і зрабілі крокі ў міжнародным супрацоўніцтве для стварэння кінастужак у найбліжэйшай перспектыве. У прыватнасці Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» падпісала пагадненне з кітайскай «Sichuan Blue Eyes Film and Television Culture Media Co» аб стварэнні сумеснага кінапраекта. Папярэдне вядома, што ён будзе прымеркаваны да гадавіны з моманту ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж дзвюма краінамі. А ў аснову стваральнікі плануюць пакласці гісторыю маладых людзей з Беларусі і Кітая, і праз гэта паказаць не толькі ўзаемадзеянне людзей, але і культуру нашых народаў. Здымаць кінастужку будуць на тэрыторыі абедзвюх краін, і працаваць над праектам таксама стануць спецыялісты творчых груп дзвюх дзяржаў. Афіцыйны старт міжнароднага праекта прызначаны на 20 студзеня 2024 года.

— На кінафестывалі я быў у складзе журы і прысутнічаў на адкрыцці. Калі на экране пачалі паказваць рэжысёраў, акцёраў, якія раней бралі ўдзел у кінафоруме, то ўсе падняліся са сваіх месцаў у знак павагі да іх, што мяне вельмі ўзрушыла. Гэта паказвае адкрытую душу беларусаў, — кажа **кітайскі акцёр кіно і тэлебачання, прадзюсар Лэй ХАНЬ.** — Ведаю, што і раней кітайскія фільмы ўдзельнічалі ў кінафестывалі, але хочацца, каб і надалей яшчэ больш акцёраў і рэжысёраў з Кітая маглі прымаць удзел у гэтым кінафоруме і дэманстраваць свае таленты. Таксама спадзяюся, што і на наступным фестывалі будзе прадстаўлена кітайскае кіно. Бо мне падабаецца, што тут заўважаеш павагу не толькі ў бок сталага пакалення кінастваральнікаў, але і да пакуль яшчэ малавядомых маладых акцёраў, рэжысёраў, сцэнарыстаў. І ўдзел у такім кінафоруме важны для іх станаўлення ў будучыні.

Кадры з мультфільма «Вечарынка», які татарскія аўтары стварылі паводле вершаў Янкі Купалы.

ДЗЕ БЕЛАРУСКАЕ КІНО?

У пяці намінацыях прайшлі конкурсныя паказы, і іх вынікі абвясцілі на цырымоніі ўрачыстага закрыцця фестывалю. У гульнявым кіно праграму склалі 11 кінастужак з Расіі, Пакістана, Кітая, Японіі, Ірана і іншых краін. Але, на жаль, карцін беларускай вытворчасці сёлета там не прадставілі. Тут можна выказваць розныя меркаванні, але, як патлумачыла **праграмны дырэктар конкурсу ігравога кіно Таццяна КОМАНАВА**, прычынай з'яўляецца і адзін нюанс.

— Мы першапачаткова клапаціліся пра нашых гледачоў, каб паказваць ім найлепшыя фільмы, якія яшчэ ніхто не бачыў. І таму рэгламент прадугледжвае, што фільм можа быць заяўлены, толькі калі раней ён не быў у камерцыйным пракаце на тэрыторыі Беларусі. Так, было вельмі крыўдна, што наш мэтр Аляксандр Яфрэмаў не мог з гэтай прычыны прадставіць свой фільм «Ліст чакання». І гэта не адзіны фільм, зняты сёлета кінастудыяй. Але гэты нюанс прымушае нас думаць пра тое, каб некаторыя карціны выпускаць да фестывалю, і толькі потым даваць у пракат...

Аднак былі прадстаўлены кінастужкі беларускай вытворчасці і ў праграме неігравога кіно — «Лахва. Цана свабоды» Уладзіміра Луцкага і «Прэзідэнцкі аркестр» Дзмітрыя Сарокі. Фільм адкрыцця «Кіношнікі» Кірыла Халецкага браў удзел у конкурснай праграме «Кіно маладых». Пяць кінаработ прэзентавалі ў праграме анімацыйнага кіно на «Лістападзе». І, як распавёў **праграмны дырэктар анімацыйнага кіно Канстанцін АНДРУШАЧКІН**, у гэтым кірунку ў нас ёсць будучыня:

— На кінафестывалі было прадстаўлена пяць беларускіх мультфільмаў, сярод якіх тры — вытворчасці «Беларусьфільм», адзін беларуска-расійскай вытворчасці і адзін ад Свята-Елісавецінскага манастыра. І дадаткова быў паказаны яшчэ мультфільм па-беларуску расійска-татарстанскай вытворчасці, зняты па творчасці Янкі Купалы. У праграме анімацыі беларускае кіно было прадстаўлена добра. І ствараем мы яго з улікам сучасных тэндэнцый. Напрыклад, здымаючы мультыплікацыйны фільм «Тошка і яго сябры. Перазагрузка», мы выкарыстоўвалі нейрасеткі. Усяго ў праграме анімацыйнага кіно было 36 работ прадстаўлена ў конкурсе, і паказвалі іх у дзвюх праграмах: для дзяцей і дарослых (16+). Паказы адбываліся паралельна з «Лістападзікам», але на колькасць наведвальнікаў нашых сеансаў адмоўна гэта не паўплывала.

Акрамя таго гледачам прапанавалі сёлета Дні кіно Расіі, Сірыі, Казахстана, Пакістана. Атмасферу настальгіі стварылі паказы кінастужак з пазаконкурснай праграмы — фільмы з калекцыі савецкай класікі. У пазаконкурснай праграме паказалі таксама такія беларускія кінастужкі, як «Азарычы. Палеская трагедыя» Уладзіміра Каралёва, «Дачка Прыпяці» Ігара Бышнёва. Сваімі ацэнкамі і ўражаннямі ад «Лістапада» і тэндэнцый у кінаіндустрыі на сустрэчы падзяліўся **расійскі кінакрытык, кіназнаўца Аляксандр СЕМЯНЮК:**

— Сёння канчаткова наступіла эпоха сімвалічнага кіно. І ў гэтым сэнсе кітайскае кіно найбольш адпавядае часу і прыродзе такога кіно, — кажа кіназнаўца. — Таму для Беларусі вельмі добра, што стратэгічным партнёрам з'яўляюцца не амерыканцы ці французы, у якіх цяпер сур'ёзны крызіс у кіно, а менавіта калегі з Кітая. І добра, што з боку Расіі нас прадстаўляе ў супрацоўніцтве Ігар Угольнікаў. Мяркую, найлепшы сучасны фільм пра вайну — гэта «Падольскія курсанты», бо там ёсць вобраз пераадолення смерці жыццём, ёсць вобраз пералому ў вайне і вобраз Перамогі ў самым фінале. Такое вобразнае кіно сёння павінна пераважаць. І адпаведна моладзь, якая навучаецца ў кінашколах, трэба вучыць ствараць такія фільмы... Таму, лічу, такія крокі ў супрацоўніцтве стануць для беларусаў добрым стартам для стварэння ў перспектыве новага паўнавартаснага беларускага кіно.

ХТО І ЧАГО ВАРТЫ І КУДЫ ДАЛЕЙ?

Кінапрадзюсар Сяргей БАГІРАЎ таксама падхапіў гэтую тэму, адзначыўшы, што пытанне існавання і прэзентацыі беларускага кіно на такіх форумах вельмі важнае:

— Гэты «Лістапад» я бачу як рэпетыцыю перад юбілейным форумам наступнага года. Прайшла яна паспяхова. Але хацелася б мець не толькі кітайскае кіно ва ўсіх намінацыях, але і беларускае ў розных намінацыях. Хацелася б больш зносін з калегамі, бо толькі так магчыма выбудоўваць сваю далейшую перспектыву жыцця. Я штогод здымаю ў Беларусі па серыяле. Я бачу гэтых людзей і разумею, што здольныя яны на многае. Яны ўсё ўмеюць, але ім трэба даць магчымасць.

Знайшлі сваіх наведвальнікаў творчыя сустрэчы, майстар-класы, дні адкрытых дзвярэй у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў і на кінастудыі «Беларусьфільм». Наведаўшы апошнюю, можна было не толькі, як кажуць, зазірнуць за кулісы стварэння кінафільмаў, пагаварыць з іх творцамі, але і паглядзець некаторыя з іх работ. Паказалі ў гэты дзень вядомыя ўжо нашаму гледачу фільмы «На другім беразе» Андрэя Хрулёва і «Ліст чакання» Аляксандра Яфрэмава. Абодва вартыя ўвагі, бо адлюстроўваюць важныя тэмы мінулага і сучаснага жыцця...

— Найперш хочацца падзякаваць журы за сумленную, правільную і прынцыповую працу на сёлетнім «Лістападзе». Гэта важна, таму што на фестывалі прафесійнае журы — той самы «гамбургскі рахунак», які паказвае, хто чаго варты. Вынікі фестывалю даюць пэўныя высновы і для нас. Бо мы мелі магчымасць убачыць, як наша кіно глядзіцца на фоне іншых, хоць сёлета яно не было прадстаўлена ў намінацыі дзіцячага кіно і, на жаль, у асноўным конкурсе. Трэба зрабіць высновы, куды і як рухацца далей. Ёсць правал пакаленняў, калі мэтры ўжо паціху адыходзяць ад працы, а моладзь спрабуе, абяцае, але ці не ўсе ў беларускім кіно засталіся альбо не ўсе сябе праявілі, што таксама дае глебу для роздумаў. Пакаленне рэжысёраў і сцэнарыстаў, яно проста так не з'яўляецца, — адзначае **начальнік аддзела па кінематаграфіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Ірына ДРЫГА.** — І тыя фільмы, якія выклікалі найбольшыя сімпатыі ў гледачоў сёлета на «Лістападзе», — гэта ўсё ж кіно з гісторыяй. Калі ёсць добры сцэнарый, то такая гісторыя зверне на сябе ўвагу. А далей ужо праца рэжысёра, як прыгожа і сучасна яе падаць. Дзве вечныя тэмы, любоў і смерць, ніколі не страцяць актуальнасці.

Алена ДРАПКО.

ГРАФІКА, ЖЫВАПІС, ДЫЗАЙН...

Уручана Нацыянальная прэмія ў галіне выяўленчага мастацтва

З 2017 года ў беларускіх мастакоў, скульптараў, дызайнераў з'явіўся ўласны «Оскар» — Нацыянальная прэмія ў галіне выяўленчага мастацтва. Гэты прэстыжны конкурс ладзіцца раз на тры гады. Якраз сёлета падведзены вынікі чарговага творчага спаборніцтва.

Андрэй ВАРАБ'ЁЎ. «Нараджэнне, жыццё, смерць і жыццё пасля смерці».

З творамі прэтэндэнтаў і лаўрэатаў можна было азнаёміцца з 27 кастрычніка на выставе ў Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь. Атрымаўся своеасаблівы зрэз мастакоўскага жыцця краіны — работы ў розных жанрах, творы жывапісу, графікі, скульптуры, дызайну, манументальнага, манументальна-дэкаратыўнага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, да таго ж самай рознай тэматыкі. Але заўважна, што ў цэнтры ўвагі аўтараў — нацыянальная культурная спадчына і гістарычная памяць. Цэлы месяц наведнікі, сузіраючы гэткія разнапланавыя работы, адабраныя журы, гадалі, хто ж у выніку пераможа.

І вось інтрыга раскрытая: 22 лістапада ў Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў адбылася ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў Рэспубліканскага конкурсу «Нацыянальная прэмія ў галіне выяўленчага мастацтва ў 2023 годзе». У намінацыі «Манументальнае і манументальна-дэкаратыўнае мастацтва» найлепшым прызнаны Аляксандр Шапо — яго кампазіцыю «Дрэва дарог» кожны можа пабачыць на станцыі метро «Вакзальная». Аўтар распавёў, што працаваў над кампазіцыяй пяць гадоў, з любоўю і ад чыстага сэрца. Філасофская канцэптуальная скульптура Андрэя Вараб'ёва «Нараджэнне, жыццё, смерць і жыццё пасля смерці» — гіганцкая галава з заплюшчанымі вачыма, на якой сядзіць маленькая птушачка, — прынесла аўтару перамогу ў намінацыі «Скульптура».

Усевалад ШВАЙБА з серыі «Хатынь».

У намінацыі «Жывапіс» з серыяй работ «Іерусалім. Спякота і холад Вечнага горада» перамог Васілій Васільеў, у намінацыі «Творчы Дэбют» — Марта Шчэрбіч. Яркая работа маладой мастачкі «Калейдаскоп» увасобіла дзіцячыя ўспаміны пра наведванне Камароўскага рынку ў Мінску. Вядомая габеленшчыца Наталля Лісоўская скарыла намінацыю «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва» — яе творы адсылаюць да архетыпаў, да нацыянальных традыцый. Усевалад Швайба за серыю работ «Хатынь» стаў лаўрэатам у намінацыі «Графіка». Масцітыя аўтары Глеб Отчык і Сяргей Варкін — у намінацыі «Дызайн». На конкурс быў прадстаўлены іх дызайн-праект экспазіцыі Слуцкага краязнаўчага музея. Глеб Отчык, які з'яўляецца старшынёй Беларускага саюза мастакоў, падчас цырымоніі прызнаўся: ён рады, што журы конкурсу адзначыла гэтую работу, таму што яна важная як для жыхароў Слуцка, так і для наведнікаў музея. Валерый Калтыгін, вядомы керамік, арганізатар міжнародных пленэраў, атрымаў узнагароду ў намінацыі «За ўклад у развіццё выяўленчага мастацтва».

Наталля ЛІСОЎСКАЯ. «Сенажаць».

Аляксандр ШАПО. «Дрэва дарог» на станцыі метро «Вакзальная».

Выстава, на якой можна пабачыць творы пераможцаў, будзе працаваць яшчэ некалькі дзён, да 26 лістапада.

Людміла ІВАНОВА.

ВІРТУАЛЬНЫ МУЗЕЙ, ПРЫСВЕЧАНЫ ПІСЬМЕННІКУ-ЗЕМЛЯКУ

У апошнія дзесяцігоддзі галоўнымі асяродкамі краязнаўчай работы ў краіне па праве з'яўляюцца бібліятэкі. Абласныя, раённыя, гарадскія, гарпасялковыя, сельскія, бібліятэкі аграгарадкоў... Зладжаная праца захавальнікаў і прапагандыстаў кніжных скарбаў самым цесным чынам звязана са збіраннем матэрыялаў па гісторыі роднага краю. І пры гэтым бібліятэкары ў сваіх памкненнях захаваць памяць мінулых часін, біяграфію нашых прашчураў актыўна карыстаюцца найноўшымі лічбавымі тэхналогіямі.

Яркі прыклад — стварэнне розных электронных рэсурсаў, карыстацца якімі можна і пры наведванні бібліятэк, а таксама анлайн. У дзяржаўнай установе культуры «Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса» створаны і працуе «Віртуальны музей Алеся Махнача». Каб наведаць яго, дастаткова зайсці на сайт раённай бібліятэкі.

— Мы з вялікай пашанай ставімся да творчай спадчыны пісьменнікаў-землякоў, — расказвае **дырэктар раённай бібліятэкі Аксана ДРАЧАН**. — Уздзеншчына — сапраўднае гняздо паэтаў, празаікаў... Варта згадаць хаця б народнага пісьменніка Беларусі Кандрата Крапіву, славутага драматурга, які нарадзіўся ў вёсцы Нізок, Петруся Броўку, Паўлюка Труса, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Васіля Шырко, класіка дзіцячай літаратуры Алеся Якімовіча, не менш цікавага дзіцячага пісьменніка Алеся Пальчэўскага, кандыдата філалагічных навук, аўтара кніг пра Цётку Лідзію Арабей, краязнаўчага пісьменніка Уладзіміра Кісялёва, публіцыста Мікалая Караля, празаіка і драматурга, галоўнага рэдактара газеты «Літаратура і мастацтва» Ілью Гурскага, паэта Антона Бялевіча... Дарэчы, пра Нізок. І Крапіва, і Арабей, і Паўлюк Трус — усе родам з гэтай вёсачкі. А яшчэ тут нарадзіўся народны артыст Беларусі Анатоль Трус. З Нізка родам адзін з арганізатараў і кіраўнікоў камсамольска-маладзёжнага антыфашысцкага падполля на Міншчыне і Магілёўшчыне ў Вялікую Айчынную вайну Павел Фаміч Валожын. У вёсцы Забалацце на Уздзеншчыне нарадзіўся пісьменнік і драматург Алесь Махнач. Закончыўшы ў 1941 годзе Калінкавіцкае ваеннае вучылішча, ён быў размеркаваны на службу ў Брэсцкую крэпасць. У час абароны крэпасці трапіў у палон. Быў вызвалены з канцлагера ў 1945 годзе. Доўгі час правёў у ваенных шпіталях. А з 1947 да 1953 года загадваў Прысынкаўскай сельскай бібліятэкай. Пасля працаваў у «Літаратуры і мастацтве». Закончыў Літаратурны інстытут імя А. М. Горкага... Алесь Іванавіч займаўся драматургіяй, пісаў творы для юнага чытача.

І, што выклікае ў нас асаблівыя пачуцці, быў частым госцем ва Уздзе, у бібліятэцы. Ён, здаецца, і цяпер застаецца для нас дарадцам, добрым і жывым сябрам...

У «Віртуальным музеі Алеся Махнача» — некалькі раздзелаў: «З аўтабіяграфіі Алеся Махнача»; «Я пазнаёміўся з табой, вайна...»; «На ніве культуры»; «Радкі, напісаныя сэрцам»; «Летапіс краязнаўчай працы»; «З архіва Алеся Махнача»; «Успаміны пра пісьменніка»; «Перапіска з землякамі»; «Алесь Махнач на радзіме»; «Фільмаграфія»; «Ушанаванне памяці». Надзвычай багаты дакументальны і мастацкі архіў!.. У ім захоўваюцца і ненадрукаваныя раней творы. І калі не цяпер, то з часам, несумненна, яны будуць надрукаваны на паперы. У электронным архіве Алеся Махнача ва Уздзе — і яго ўнікальныя ўспаміны пра жыццё на Уздзеншчыне ў пасляваенныя гады. Старонкі пра побыт, сацыяльныя зносіны, стасункі чалавека і ўлады чытаюцца лепей і цікавей, чым іншыя раманы, дзе часам і на каліва не было праўды пра жыццё.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Васіль Шырко так аднойчы выказаўся пра любімага уздзенцамі пісьменніка-франтавіка: «Ёсць людзі, знаёмства з якімі не толькі застаецца назаўсёды ў памяці, але і аказвае ўплыў на светапогляд іншых. Такім для многіх жыхароў Уздзеншчыны быў Алесь Іванавіч Махнач».

А вось гэтыя словы пра Махнача належаць былому дырэктару Уздзенскага раённага краязнаўчага музея Анатолю Папко: «Цудоўны быў чалавек. Шчыры ў адносінах з аднавяскоўцамі, землякамі, ён поўнасцю аддаваў сябе працы па ўшанаванні людзей, вартых добрага слова, падзей, што пакінулі адметны след у гісторыі»...

...Сярод многіх кніг Алеся Махнача, што знаходзяцца ў фондах і на экспазіцыйных паліцах Уздзенскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя П. Труса, — краязнаўчыя нарысы «Забалацце» і «Нізок». Яны выйшлі дзякуючы намаганням руплівага выдаўца Віктара Хурсіка ў серыі вясковазнаўчых нарысаў «Ведаць свой край Беларусь». Алесь Махнач быў захоплены краязнаўствам, ён нягледзячы на ўсе праблемы са здароўем, карпеў у архівах, часта наведваўся на Уздзеншчыну. І нават незадоўга перад смерцю разам з аматарамі пошукаў сакральных аб'ектаў прайшоўся уздзенскімі сцежкамі, выступіў у ролі дасведчанага і шчыра зацікаўленага ў прадстаўленні роднай старонкі экскурсавода. Згадкі пра ўспаміны, краязнаўчыя нарысы падказваюць неабходнасць валодання ёмістай, асобнай, паўнавартаснай творчай спадчынай Алеся Махнача. Добра было б зрабіць гэта ў пярэдадзень 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў ці хаця б да 80-годдзя Вялікай Перамогі. Салдат-пакутнік, чалавек драматычнага і разам з тым шчаслівага лёсу, шчыры служка роднаму краю, аўтар многіх твораў пра Вялікую Айчынную вайну, пра Брэсцкую крэпасць і яе абаронцаў, несумненна, варты гэтага.

Раман СЭРВАЧ.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Информация о проведении открытого аукциона 29 декабря 2023 г. на право аренды земельного участка

Организатор аукциона: Смолевичский районный исполнительный комитет, 222201, г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь (га)	Целевое назначение	Срок аренды	Начальная цена земельного участка (бел. руб.)
1	Смолевичский район, Усяжский с/с, пос. Усяж, ул. Промышленная, 14А	624885606601000336	1,4477	Для строительства и обслуживания историко-образовательного центра (объект № 10/2023) (1 16 20 земельный участок для размещения объектов неустановленного назначения)	99 лет	23 742,28

Аукцион состоится **29 декабря 2023 г. в 15.00** в Смолевичском районном исполнительном комитете по адресу: *г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125*, зал заседаний.

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: **https://au.nca.by/, http://rlt.by/ru/,** Смолевичского райисполкома: **isp@smolevichi.gov.by,** на сайте Минского областного исполнительного комитета.

УНП 600014139

ИЗМЕНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ООО «Датч Стар»,

опубликованной в газете «Звязда» 01.09.2022 г.

по объекту «Жилая застройка со встроенными помещениями общественного назначения в границах пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Папанина» (2-я очередь строительства)

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются:

20 (двадцать) двухкомнатных квартир **площадью от 67 до 143 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 3 410 до 4 600 белорусских рублей,** с обязательным условием приобретения не менее одного машиноместа в объекте «Жилая застройка со встроенными помещениями общественного назначения в границах пр-та Дзержинского – ул. Щорса – ул. Папанина (2-я очередь строительства, 3-й пусковой комплекс)».

На предприятии действует система регулирования стоимости, зависимая от площади, этажа и условий оплаты объекта строительства.

Условия оплаты – полная оплата цены договора в течение 3-7 календарных дней с момента регистрации договора долевого строительства в Комитете строительства и инвестиций Мингорисполкома.

Ознакомление дольщиков с планировками квартир, предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства, осуществляется по предварительной договоренности в рабочее время ООО «Датч Стар» по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, пом. 1515.

Тел.: 375 (17) 336 73 88, 375 (44) 534 30 00, 375 (29) 534 30 00.

УНП 191061436

ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ ООО «Датч Стар»,

опубликованную в газете «Звязда» 03.03.2022 г.

по объекту «Жилая застройка со встроенными помещениями общественного назначения в границах пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Папанина» (1-я очередь строительства)

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются:

2 (две) однокомнатных квартиры площадью **71,54 кв. м,** стоимость 1 кв. м от **3 720 до 4 200 белорусских рублей,** с обязательным условием приобретения не менее одного машиноместа в объекте «Жилая застройка со встроенными помещениями общественного назначения в границах пр-та Дзержинского – ул. Щорса – ул. Папанина (2-я очередь строительства, 3-й пусковой комплекс)».

5 (пять) двухкомнатных квартир площадью **от 79 до 138 кв. м,** стоимость 1 кв. м от **3 658 до 4 300 белорусских рублей,** с обязательным условием приобретения не менее одного машиноместа в объекте «Жилая застройка со встроенными помещениями общественного назначения в границах пр-та Дзержинского – ул. Щорса – ул. Папанина (2-я очередь строительства, 3-й пусковой комплекс)».

На предприятии действует система регулирования стоимости, зависимая от площади, этажа и условий оплаты объекта строительства.

Условия оплаты – полная оплата цены договора в течение 3-7 календарных дней с момента регистрации договора долевого строительства в Комитете строительства и инвестиций Мингорисполкома.

Ознакомление дольщиков с планировками квартир, предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства, осуществляется по предварительной договоренности в рабочее время ООО «Датч Стар» по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, пом. 1515.

Тел.: 375 (17) 336 73 88, 375 (44) 534 30 00, 375 (29) 534 30 00.

УНП 191061436

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Гроднохлебпром»

Аукцион состоится 11.12.2023 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71

Лот № 1	
Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона	ЛОТ 1: - капитальное строение, инв. № 410/С-12464 (назначение – здание многофункциональное 2 29 25, наименование – многофункциональное здание), общей площадью 69,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Волковыск, ул. Школьная, 16; - капитальное строение, инв. № 410/С-19981 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства 3 10 00, наименование – водопровод), протяженностью 23,0 м, расположенное по адресу: г. Волковыск, ул. Школьная, 16; - капитальное строение, инв. № 410/С-19986 (назначение – сооружение специализированное энергетики 3 08 00, наименование – газопровод), протяженностью 10,0 м, расположенное по адресу: г. Волковыск, ул. Школьная, 16; - капитальное строение, инв. № 410/С-19988 (назначение – сооружение неустановленного назначения 3 99 99, наименование – мощение), общей площадью 177,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Волковыск, ул. Школьная, 16/1; - капитальное строение, инв. № 410/С-19983 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства 3 10 00, наименование – канализация), протяженностью 14,9 м, расположенное по адресу: г. Волковыск, ул. Школьная, 16; - устройство молниеотвода. Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 420850100001001674, площадью 0,0763 га (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли 1 16 03), расположенном по адресу: г. Волковыск, ул. Школьная, 16. Условия аукциона: - оплата должна быть внесена в течении 30 (тридцати) календарных дней с даты заключения договора; - расходы, связанные с государственной регистрацией сделки, несет Покупатель; - возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по оказанию услуг по независимой оценке в размере 679,80 р.; - возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по уплате вознаграждения организатору торгов в размере 5 % от конечной цены продажи
Начальная цена продажи	67 393,78 р. (шестьдесят семь тысяч триста девяносто три рубля семьдесят восемь копеек) с учетом НДС
Сумма задатка	6 739 р. (шесть тысяч семьсот тридцать девять рублей)
Реквизиты для перечисления задатка	BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225
Место, дата и время окончания приема заявлений	Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18. Последний день приема заявлений – **07.12.2023 г. до 15.00**
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 05.08.2023 г.	
Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony	

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607. УНП 191021390
Продавец	ОАО «Паритетбанк», г. Минск, ул. Киселева, 61а. УНП 100233809.
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. УНП 191224638 (**www.ipmtorgi.by**)

Предмет электронных торгов – транспортные средства, бывшие в употреблении.
Местоположение: г. Минск, ул. Киселева, 61А

Лот №	Наименование лота	Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.
1	**Грузопассажирский специальный фургон (инкассация) Volkswagen Caddy**, АК 5690-7, 2009 г. в., инв. № 20276	**10 080,00**
2	**Грузопассажирский специальный фургон (инкассация) Renault Master CA-3500 «LUBAVA»**, ОА 6334-7, 2016 г. в., инв. № 6296	**28 920,00**

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов: победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – единственный участник аукциона), обязан произвести оплату в размере 100 % стоимости имущества не позднее **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи

Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы». Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить **вознаграждение организатору торгов по лотам 6 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов.
Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, все мероприятия по снятию с учета в органах ГАИ, Гостехнадзора и иных регистрирующих органах, несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 29.12.2023 с 11.00 до 12.00.

Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 28.12.2023 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 44-704-92-06
E-mail: auction@cpo.by

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»

(организатор аукциона) по поручению **Гомельского филиала РУП почтовой связи «Белпочта»** (продавец) извещает о проведении 18 декабря 2023 года открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, каб. 2.9

№ лота	Наименование лотов	Начальная цена продажи, бел. руб., с учетом НДС (20 %)	Сумма задатка, бел. руб., с учетом НДС (20 %)
1	**Помещение площадью 33,2 (21,5 и 11,7) кв. м** в изолированном помещении – помещение связи с инв. № 340/D-213112, помещение на 4-м этаже. **Адрес:** г. Речица, ул. Советская, 66-2. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка – 0,2. Коэффициент месторасположения – 1,0	**140,27**	140,27
2	**Помещение площадью 35,4 (30,3 и 5,1) кв. м** в капитальном строении – здание отделения связи с инв. № 320/С-19750, помещение на 1-м этаже. **Адрес:** г. Жлобин, ул. Шоссейная, 135. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка – 0,25. Коэффициент месторасположения – 0,6	**149,57**	149,57
Сведения о продавце	Гомельский филиал РУП «Белпочта», г. Гомель, ул. Советская, 8, тел. 8 (0232) 79-69-76		
Срок подачи заявления	**С 25.11.2023 г. по 14.12.2023 г.** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. 2.9. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения		
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с BY35 AKBB 3012 0210 2005 4310 0000, в ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY2X, УНП 400395996, **получатель – Гомельский филиал РУП почтовой связи «Белпочта»,** назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах за лот №_ (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). Код назначения платежа – 40901 «Перечисление гарантийного взноса»		
Условия пользования	Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, организация производства (кроме вредных производств)		
Размер штрафа	Лоты №№1, 2 – 2 (две) базовые величины, согласно Указу Президента РБ от 10.01.2013 г. № 14 «О внесении изменений и дополнений в Указ Президента РБ от 05.05.2009 г. № 232» (Об определении размера штрафа в случае отказа или уклонения участника, выигравшего торги от условий проведения аукционных торгов, согласно действующему законодательству)		

Срок договора аренды – 5 (пять) лет, шаг аукциона – 10 (десять) %.
К участию допускаются индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица.

Необходимо в адрес Организатора торгов подать заявление по установленной форме, подписать соглашение с Организатором торгов и предоставить необходимые документы: юридическим или физическим лицом, а также индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя; юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; представителем юридического лица или индивидуального предпринимателя – предъявляет оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия. При заключении договоров аренды ставка арендной платы может быть скорректирована с учетом обязательности применения в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 г. № 150 понижающих или повышающих коэффициентов в зависимости от вида деятельности, осуществляемой на арендуемых площадях, и категории арендатора. В случае единственного участника торгов, ему будет предложено приобрести лот по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) процентов**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) обязан: подписать протокол о результатах аукциона; возместить Организатору аукциона затраты на организацию и проведение торгов, Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а так же в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня его проведения, за вычетом внесенной им суммы задатка. С участником, ставшим победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение **10 (десяти) рабочих дней** после проведения аукциона и подписания протокола будет заключен договор аренды недвижимого имущества. В срок не позднее **5 (пяти) рабочих дней** после подписания договора аренды победитель торгов обязан подписать акт приема-передачи арендуемого имущества.

Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049 (изм. от 14.08.2021 № 465).

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by/ в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база».

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».

Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-56, 8 (044) 599-18-16.

БУЭНАС-АЙРЭС ПАВЯРНУЎ НАПРАВА

Куды рушыць Аргенціна пасля выбараў?

Па выніках усеагульных выбараў у Аргенціне былі абраны прэзідэнт, віцэ-прэзідэнт, члены нацыянальнага кангрэса, а таксама губернатары большасці правінцый. Новым кіраўніком другой па велічыні эканомікі краіны Паўднёвай Амерыкі быў абраны Хаўер Мілей. У другім туры выбараў несістэмны ўльтраправы палітык перамог дзейнага міністра эканомікі Сергіа Масу (55,7 працэнта галасоў супраць 44,3). Апошні яшчэ да абвяшчэння афіцыйных вынікаў павіншаваў суперніка з перамогай. Дзейны прэзідэнт Аргенціны Альберта Фернандэс заявіў, што адразу гатовы пачаць работу па перадачы ўлады абранаму кіраўніку дзяржавы Хаўеру Мілею. Яго інаўгурацыя павінна адбыцца 10 снежня. Падчас выбарчай кампаніі Мілей абяцаў радыкальна змяніць як унутраную палітыку краіны, так і яе знешнепалітычны курс. Куды ж рушыць Аргенціна з новым прэзідэнтам?

Кандыдат з бензапілой

53-гадовы Хаўер Херарда Мілей атрымаў вядомасць у Аргенціне як вучоны-эканаміст, аўтар і вядучы шэрагу праграм на радыё і тэлебачанні. У 1993-м ён скончыў Універсітэт Бельграна, атрымаў ступень бакалаўра эканомікі і працягнуў навучанне ў Інстытуце эканамічнага і сацыяльнага развіцця, а таксама ва Універсітэце Таркуатадзі-Тэла. У юнацтве ён спяваў у рок-гурце і быў варатаром футбольнай каманды.

Аб асабістым жыцці палітыка вядома мала. Ён не жанаты. У мінулым сустракаўся са спявачкай Даніэлай Моры, а цяпер, згодна з паведамленнямі сацсетак, знаходзіцца ў рамантычных адносінах з актрысай Фацімай Флорэс. Самым блізкім чалавекам ён лічыць сваю малодшую сястру Карыну. У Мілея пяць сабак пароды англійскі мастыф, якіх ён называе сваімі чацвераногімі дзецьмі. Усе пяць сабак — клоны яго сабакі Конана, якога не стала ў 2017-м.

Мілей больш за 20 гадоў выкладаў розныя эканамічныя дысцыпліны ў ВНУ Аргенціны і іншых краін. Ён удзельнічаў у канферэнцыях, пісаў навуковыя працы, выдаваў кнігі. Працаваў эканамістам у розных структурах, у прыватнасці ў аргенцінскім аддзяленні найбуйнейшай банкаўскай карпарацыі лонданскага Сіці HSBC і ў буйным пенсійным фондзе Maxima. З 2012-га Мілей узначальваў аддзел эканамічных даследаванняў у нацыянальным аналітычным цэнтры Fundacion Acordar. Ён уваходзіў у групу эканамічнай палітыкі Міжнароднай гандлёвай палаты (саветнік G20) і Сусветнага эканамічнага форума. Мілей называе сябе прыхільнікам аўстрыйскай эканамічнай школы і лібертарыянцаў. Гэтая плынь, заснаваная ў Аўстрыі Карлам Менгерам у канцы XIX стагоддзя, вызнае прынцып мінімальнага ўмяшання дзяржавы ў жыццё краіны.

У палітыку Мілей прыйшоў у 2019-м, далучыўшыся да Лібертарыянскай партыі, якая ўвайшла ў склад апазіцыйнай кааліцыі «Свабода надыходзіць». У 2021-м Мілей быў абраны дэпутатам нацыянальнага кангрэса. Падчас перадвыбарнай кампаніі Мілей рабіў асноўны акцэнт на крытыцы палітычнага істэблішменту. Ён выступае за скасаванне Цэнтральнага банка і шэрагу міністэрстваў, у тым ліку міністэрстваў працы і адукацыі, а нацыянальную валюту песа прапануе замяніць доларам ЗША. Для вырашэння эканамічных праблем Мілей мае намер сур'ёзна ўрэзаць бюджэтныя расходы, абяцаючы не скарачаць пры гэтым сацыяльную падтрымку насельніцтва. Акрамя таго, ён плануе прыватызацыю дзяржкампаній, у тым ліку ў сферы адукацыі і аховы здароўя. Мілей прапануе доўгатэрміновую эканамічную праграму адраджэння Аргенціны. Паводле яго слоў, ён разлічвае на 35—50 гадоў рэформаў.

Многія аргенцінцы лічаць Мілея папулістам і шоўменам — на перадвыбарныя мітынгі ён часта выходзіў з бензапілой у руках, якая з'яўлялася сімвалам яго барацьбы з «палітычнай кастай», што склалася за апошнія гады ў Аргенціне. У якасці перадвыбарчага сцяга ён абраў жоўтае палатно з выявай грымучай змяі, якая скруцілася ў клубок, і лозунгам «Не наступай на мяне». За свае эпатажныя выступленні і часта вельмі экстравагантныя меркаванні Мілей атрымаў у Аргенціне мянушку «міні-Трамп».

Спадзяванні на цуд

Некаторыя погляды і выказванні Мілея выклікалі бурныя дыскусіі ў сацсетках і крытыку з боку шматлікіх аргенцінцаў. Ён выступае супраць абортаў, за свабоднае нашэнне зброі, легалізацыю наркотыкаў і законны продаж чалавечых органаў. Аднойчы ён раскрытыкаваў Папу Рымскага Францыска (які з'яўляецца аргенцінцам і вельмі шануецца ў краіне), назваўшы яго прадстаўніком усяго самага шкоднага на планеце.

Мілей неаднаразова заяўляў, што не мае намеру садзейнічаць развіццю міждзяржаўных адносін з Кітаем, Бразіліяй і Расіяй з-за нязгоды з палітыкай гэтых дзяржаў. Пры гэтым ён сцвярджаў, што не будзе перашкаджаць прыватнаму бізнесу весці справы з гэтымі краінамі. Ён лічыць прыярытэтнымі саюзнікамі Аргенціны ЗША і Ізраіль, а таксама мае намер адазваць ужо адобраную заяўку на ўступленне Аргенціны ў БРІКС.

Аб намеры краіны адмовіцца ад членства ў гэтай уплывовай міжнароднай арганізацыі заявіла напярэдадні эканамічны саветнік Мілея і кандыдат на пасаду міністра замежных спраў Дзіяна Мандзіна. Яна дадала, што новае кіраўніцтва краіны не мае нічога за ці супраць БРІКС. «Мы не разумеем, у чым выгада Аргенціны ў дадзены момант. Калі потым акажацца, што выгада ёсць, мы прааналізуем гэта», — сказала яна РІА «Новости». Як вядома, на саміце БРІКС у Ёханесбургу ў жніўні было абвешчана рашэнне запрасіць Аргенціну, Егіпет, Іран, Эфіопію, ААЭ і Саудаўскую Аравію стаць паўнапраўнымі сябрамі арганізацыі з 1 студзеня 2024-га.

У Крамлі звярнулі ўвагу на шэраг перадвыбарных заяў новага аргенцінскага лідара, але будуць «арыентавацца і меркаваць па тых заявах, якія ён будзе рабіць пасля інаўгурацыі», адзначыў прэс-сакратар Прэзідэнта РФ Дзмітрый Пяскоў. Як адзначыў дэкан факультэта эканамічных і сацыяльных навук Расійскай акадэміі народнай гаспадаркі і дзяржаўнай службы пры Прэзідэнце РФ Аляксандр Чычын, Мілею ўдалося перамагчы ў прэзідэнцкай гонцы дзякуючы папулісцкай рыторыцы і стаўцы на маладых выбаршчыкаў. «Нявопытнаму ў палітыцы Мілею ўдалося заваяваць сімпатыі такой жа палітычна нявопытнай моладзі дзякуючы эксцэнтрычным выступленням і папулізму. Новы прэзідэнт характарызаваў сітуацыю ў краіне як самы цяжкі крызіс у гісторыі Аргенціны. Папярэдні ўрад не здолеў яго ўтаймаваць, а таму людзі вырашылі абраць Мілея як найменшую з бед. Сваю палітыку абраны прэзідэнт азначыў шырокімі мазкамі, пры гэтым адно яго сцвярджэнне супярэчыць другому. Самі аргенцінцы, верагодна, спадзяюцца на цуд», — адзначыў аналітык. Ён мяркуе, што тактыку для сваёй перадвыбарнай кампаніі новы аргенцінскі прэзідэнт запазычыў у экс-прэзідэнта ЗША Дональда Трампа. «У эпатажнасці Мілея ёсць доля гульні. Ён і павінен быў так яскрава сябе праявіць, таму што быў невядомым палітыкам. У інфаполі Мілей з'явіўся ўсяго некалькі гадоў таму дзякуючы супрацоўніцтву са СМІ і напісанню несур'ёзных навуковых прац з вялікай колькасцю запазычанняў і плагіяту. Каб прыцягнуць да сябе ўвагу, ён вырашыў выкарыстоўваць методыку Трампа, адаптаваўшы яе пад лацінаамерыканскі электарат», — лічыць эксперт.

«Шокавая» тэрапія

Прафесар кафедры міжнародных адносін і знешняй палітыкі Расіі Маскоўскага дзяржаўнага інстытута міжнародных адносін Барыс Мартынаў у гутарцы з RT выказаў меркаванне, што яшчэ адным фактарам, які сыграў на руку Мілею, стаў адрозны ад пераністаў падыход да вырашэння праблем у эканоміцы. «Аргенціна напрыканцы XIX стагоддзя лічылася развітой краінай з адным з найбольш высокіх узроўняў жыцця ва ўсім Заходнім паўшар'і. Аднак цудоўнае геаграфічнае становішча і ўрадлівыя землі сыгралі з аргенцінцамі злы жарт. Разлічваючы выключна на рэсурсы, краіна прыйшла да застою. З устанаўленнем улады пераністаў Аргенціна паступова «скацілася» да ўзроўню краін трэцяга свету. Усё дзякуючы нявывераным сацыяльным праграмам, якія наносілі сур'ёзную шкоду эканоміцы і стымулявалі «паразітызм» у грамадстве — народ чакаў падачак ад дзяржавы», — заявіў Барыс Мартынаў.

Дарэчы, у гісторыі Аргенціны ўжо быў прэзідэнт з такімі ж, як у Мілея, ідэямі. «Карлас Менем правёў татальную прыватызацыю, увёў абмежаванні на функцыі ЦБ, прывязаў нацыянальную валюту да долара, а таксама скараціў сотні тысяч дзяржслужачых. У доўгатэрміновай перспектыве гэтыя меры заканамерна прывялі да масавага беспрацоўя. Акрамя таго, значна вырас знешні доўг, даходы ад прыватызацыі скончыліся, стала не хапаць сродкаў на штучную падтрымку парытэту песа і долара. Усё гэта прывяло да глыбокай рэцэсіі, — нагадаў Аляксандр Чычын. — Цяпер Мілей кажа, што паспрабуе пазбегнуць памылак Менема, толькі незразумела, якім чынам».

Па словах Барыса Мартынава, абяцанні пераарыентаваць знешнюю эканоміку на Захад таксама не прынясуць жаданага эфекту. «Кітай і Бразілія — гэта найбуйнейшыя гандлёвыя партнёры Аргенціны. Скарачэнне сувязі з імі толькі з-за непрыязнасці Мілея да камуністаў пацягне за сабой катастрафічныя наступствы для эканомікі», — заявіў аналітык. Тым не менш, як мяркуе Аляксандр Чычын, «гучныя і паспешлівыя» заявы Мілея на мітынгах яшчэ не азначаюць, што ён рэалізуе іх на практыцы. Напрыклад, працягвае суразмоўца RT, Мілей сам яшчэ не да канца вырашыў, хоча ён уступлення Аргенціны ў БРІКС ці не. «Мілей павінен бачыць, якія эканамічныя плюсы дае гэта арганізацыя. Пасля выбрання ён павінен будзе дзейнічаць асэнсавана. Цяперашняя палітычная сітуацыя гэтаму садзейнічае. Калі Мілей хоча ўтрымацца ва ўладзе, нельга сыходзіць з эканамічных саюзаў, — лічыць аналітык. — Сябраваць з ЗША ён будзе толькі ў выпадку перамогі Трампа, так што тут таксама яшчэ не ўсё вырашана. Выразных заяў наконт стасункаў з Расіяй палітык таксама не рабіў. Увогуле, Мілей пакуль не вызначыўся да канца з бокам, за які будзе гуляць».

Тым часам стала вядома, што Аргенціна не збіраецца разрываць адносіны з Кітаем, Бразіліяй і Расіяй. Аб гэтым будучы кіраўнік аргенцінскага МЗС Дыяна Мандзіна заявіла ў інтэрв'ю тэлеканалу TN: «Кажуць, што мы разарвем адносіны з Бразіліяй і Кітаем. Гэта рэчы, якія не маюць сэнсу і логікі. Няма ні разрыву, ні змены адносін». Журналіст тэлеканала спытаў у Хаўера Мілея, ці мае ён намер «памірыцца з Кітаем і Расіяй». «А калі я з імі сварыўся?» — адказаў Мілей.

Новы аргенцінскі лідар пацвердзіў, што налета краіна пяройдзе да «шокавай» фіскальнай тэрапіі. Ён заявіў аргенцінцам, што «грошай няма», таму дзяржаўныя выдаткі рэзка скароцяць. Тое, як менавіта ён збалансуе бюджэт, якія прыменіць механізмы і іншае, палітык не растлумачыў. Новы прэзідэнт Аргенціны толькі пацвердзіў наяўнасць пакуль неназванай каманды эканамістаў, якія зоймуцца балансам кароткатэрміновага доўгу Цэнтрабанка. Найбольш верагоднымі, па меркаванні эксперташ, могуць стаць масавы распродаж дзяржуласнасці, у тым ліку сельскагаспадарчых зямель, скупка іх транснацыянальнымі кампаніямі накшталт амерыканскай Monsanto і чарговы дэфолт па дзяржаблігацыях.

Захар БУРАК.

Даслоўна

«БЕЛАРУСЬ ЗАЦІКАЎЛЕНА Ў ДАЛЕЙШЫМ РАЗВІЦЦІ КАНСТРУКТЫЎНАГА ДЫЯЛОГУ З АРГЕНЦІНАЙ»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Хаўера Мілея з выбраннем на пасаду прэзідэнта Аргенціны. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

«Беларусь зацікаўлена ў далейшым развіцці канструктыўнага дыялогу з Аргенцінай, устанаўленні змястоўных адносін у гандлёва-эканамічнай і іншых сферах на карысць нашых краін. Спадзяюся, што пры вашай падтрымцы беларуска-аргенцінскае супрацоўніцтва будзе паслядоўна ўмацоўвацца па ўсіх напрамках, якія ўяўляюць інтарэс для абодвух бакоў», — адзначаецца ў віншаванні.

РУХАВІК УНУТРАНАГА ЗГАРАННЯ

Куды накіравацца, каб «падцягнуць» фігуру? Маніторым прапановы і цэны

Нарэшце ў нашай краіне фізічная культура стала часткай жыцця большасці людзей. Больш нікога не трэба пераконваць, што фізічная актыўнасць павінна быць у тыднёвым (а лепш — у штодзённым) раскладзе кожнага сучаснага чалавека. Але адна справа — ведаць гэты прынцып, і зусім іншае — увасабляць яго ў рэальнасць. Пакуль адны шукаюць час і магчымасці пайсці ў залу або басейн, другія — прычыны гэтага не рабіць...

Такім чынам, куды падацца, каб зрабіць цела падцягнутым, нервы — моцнымі, а настрой — роўным? З якой сумай давядзецца развітацца, каб стаць уладальнікам абанемента ў басейн, трэнажорку або на пілатэс? І, нарэшце, дзе знайсці правільны настрой і сілу волі, каб да залы, куды набыты абанемент, усё ж дайсці?

ДЗЕ ЎЗЯЦЬ МАТЫВАЦЫЮ?

Калі вы не ў курсе, то ведайце: у фітнес-цэнтрах і розных «джымах» для дарослых ёсць сезоннасць, і яна прасочваецца даволі выразна. У залах, расказваюць трэнеры, кожны год становіцца людна ў верасні, з пачаткам, скажам так, новага навучальнага года. Першая партыя, як правіла, — моладзь ад 18 да 30. Да канца кастрычніка з гэтай першай хвалі адсейваецца прыкладна палова — тыя, хто любіць фразу: «Я б з радасцю, але ў мяне няма часу на фітнес»... Пачынаючы з лістапада залы і цэнтры перажываюць другую хвалю наведвальнікаў — ужо больш старэйшых. Тых, хто да гэтага часу «ўтрос» усе пытанні з дзецьмі (а часам і ўнукамі), іх школьным раскладам, секцыямі і студыямі пасля школы і нарэшце знайшоў час заняцца сабой. Гэтых людзей, дарэчы, трэнеры лічаць больш мэтанакіраванымі, чым моладзь — яны больш свядома выбіраюць спартыўны кірунак і больш упартыя ў дасягненні мэт. Таму менавіта да лістапада — снежня многія залы і фітнес-цэнтры з году ў год прымяркоўваюць рознага роду скідкі, акцыі і бясплатныя пробныя заняткі. Дарэчы, аб пенсіянерах. Дакладней — аб пенсіянерках (іх у залах больш, чым мужчын-аднагодкаў). Сучасныя панны каралеўскага ўзросту — частыя госці і ў трэнажорках, і ў басейнах, і ў рознага роду студыях тых ці іншых фітнес-кірункаў. І вось яны, мабыць, самыя ўпартыя «байцы». Ходзяць дакладна па графіку, не прапускаюць заняткі і дасягаюць выніку: паляпшэнне самаадчування плюс знешні эфект трэніровак.

— Калі чалавек сталага ўзросту вырашае заняцца сваім здароўем, ён і да гэтага пытання падыходзіць, так бы мовіць, стала, — дзеліцца **трэнер трэнажорнай залы аднаго з сеткавых фітнес-клубаў Мінска Мікіта УШКОЎ.** — Скажу шчыра: асабіста мне падабаецца працаваць з больш старэйшымі «вучнямі». Яны не «рвуць са старту», уважлівыя да ўсіх указанняў і не «саскочаць» пасля месяца заняткаў. Што да моладзі, многія сёння скардзяцца на лішнюю вагу і недахоп часу на спорт, але пры гэтым час на тое, што наносіць шкоду здароўю, знаходзяць. На наведванне трэнажорнай залы ў іх дзвюх гадзін няма (ну, або «дорага»), затое ёсць час і грошы на сядзенне ў сацсетках, на вячоркі ў піцэрыі, на фастфуд, часам — на цыгарэты, алкаголь і г. д. І хачу дадаць да пытання аб «дорага»: калі б за тыя грошы, якія яны марнуюць на некарысную «хуткую ежу» ці іншыя «радасці жыцця», яны набылі абанемент у трэнажорную залу або басейн, ім не прыйшлося б скардзіцца на лішнюю вагу.

Няправільныя псіхалагічныя ўстаноўкі не даюць дасягнуць жаданага выніку, нават калі да фітнес-залы вы ўсё ж дайшлі, гаворыць суразмоўца.

— Трэніравацца дзеля сэлфі — шлях у нікуды: праз пару тыдняў, не бачачы прынцыповых змен, заняткі вы кінеце. І вельмі дарэмна, бо якраз у гэты час закладваюцца вынікі, якія парадуюць ужо праз месяц ці два.

Правільная матывацыя да заняткаў — 50 % поспеху, кажуць трэнеры. А каб яна была правільнай, перш за ўсё, выбіраючы фітнес-кірунак, трэба дакладна вызначыцца з прамежкавымі мэтамі. Бо галоўная мэта нязменная ў любым узросце і для мужчын, і для жанчын: трэніроўкі дзеля здароўя.

— Іншая матывацыя, на жаль, не працуе, — падкрэслівае суразмоўца. — Развітыя мышцы, рухомыя суставы, нармальная работа сэрца, здаровыя сасуды і страўнікава-кішачны тракт — гэта і ёсць прыгажосць скуры, валасоў, зубоў, добрая фігура і ў цэлым тое, што разумеюць пад словазлучэннем «прывабная знешнасць».

Але дадатковыя мэты таксама важныя, і менавіта яны вызначаюць выбар фітнес-кірунку. Жадаеце пастрайнець — патрэбны кардыянагрузкі, а калі мэта — падцягнуць адрузлыя мышцы, неабходны сілавыя трэніроўкі.

НА ЛЮБЫ ГУСТ

Сёння ў Беларусі дастаткова спартыўных цэнтраў пад любыя запыты, і варыянтаў фізічнай актыўнасці да паслуг ахвотных — хоць адбаўляй. Але найбольшым попытам карыстаюцца звыклыя і правераныя варыянты: трэнажорка, басейн, пілатэс, ёга, танцы...

ПІЛАТЭС

Некалі навінка, сёння гэты фітнес-кірунак стаў такім жа звыклым, як скандынаўская хадзьба (пра якую ніхто ўжо не жартуе: «Дзе страцілі лыжы?»). Як і ёга, пілатэс — кірунак хутчэй жаночы (хоць мужчыну з трэніроўкі, вядома, ніхто не выганіць). Трэнінг уключае элементы расцяжкі і сілавой трэніроўкі, дакладна прапрацоўвае ўсе мышцы. Лічыцца, што і ў душы пасля пілатэсу надыходзіць гармонія, але гэта ўсё лірыка. Хаця тое, што любая фізічная нагрузка вядзе да выпрацоўкі эндарфінаў, агульнавядома.

Методыка аб'ядноўвае каля 500 практыкаванняў, і гэта дазваляе трэнерам

скласці па патрэбах і фізічных магчымасцях кожнага, хто прыходзіць у залу, індывідуальную сістэму, зрабіўшы ўпор на вырашэнне канкрэтных задач: падцягнуць жывот або грудзі, прыбраць тлушч на сцёгнах, палепшыць гнуткасць, умацаваць мышцы спіны...

Лічыцца, што пілатэс не мае абмежаванняў, у першую чаргу ўзроставых.

— Праўда, ёсць адно «але», — распавядае **трэнер Аліна ШЧАВЕЛЬ.** — Выконваючы практыкаванні, важна ўнікаць у іх сутнасць: без паглыблення ў тое, што адбываецца на трэніроўцы, эфекту не дасягнуць. Няўважлівасць выканання практыкаванняў зводзіць да нуля іх вынік. Справа ў тым, што ўнікальнасць і эфектыўнасць пілатэсу забяспечваюць канцэнтрацыя, каардынацыя, правільнае дыханне, плаўнасць рухаў і цягавітасць. Калі ў залу вы прыходзіце расслабіцца, «адпусціць свае думкі» або, наадварот, нешта абдумаць, механічна выконваючы рухі, — пілатэс вам не падыдзе.

Яшчэ адзін нюанс, каб кірунак апраўдаў чаканні: пілатэс наўрад ці можна назваць эфектыўным спосабам знізіць вагу. Калі ваша мэта — мінус 10—20 кг, заняткі пілатэсам прыйдзецца спалучаць з кардыянагрузкамі і сур'ёзна карэкціраваць рацыён харчавання.

У сярэднім за абанемент на пілатэс на месяц выкласці давядзецца 120—135 рублёў (6 заняткаў па паўтары гадзіны). Прыкладна столькі ж, дарэчы, каштуе і ёга. За разавы занятак у сярэднім давядзецца заплаціць рублёў 20, але калі проста хочаце паспрабаваць, лепш пашукаць бясплатныя пробныя заняткі — цяпер для іх якраз сезон.

БАСЕЙН

Безумоўны фаварыт з восені да позняй вясны ў жыхароў нашай краіны, якія жадаюць падзаняцца сваім здароўем, — гэта, зразумела, басейн. Больш за тое, басейн у нашай падсвядомасці — сімвал і сінонім здароўя. У нашым савецкім дзяцінстве гэта быў, мабыць, адзіны даступны фітнес для ўсіх і кожнага. І сёння менавіта плаванне па-ранейшаму застаецца адным з найбольш бюджэтных кірункаў фізічнай актыўнасці. Плюс радасць узаемадзеяння з вадой, плюс даступнасць — ужо чаго-чаго, а басейнаў на душу насельніцтва ў нашай краіне дастаткова. Ну, і яшчэ адзін плюс: плаваючы, мы не заўважаем фізічных намаганняў, не вымотваемся, як, напрыклад, у трэнажорнай зале або на бегавой дарожцы. Плаванне не патрабуе канцэнтрацыі ўвагі: можна пабыць сам-насам з сабой, нешта абдумаць ці ўвогуле ні пра што не думаць. Пры гэтым плаванне ўмацоўвае ўсе групы мышцаў, хутка і бяспечна зніжае вагу, лечыць пазваночнік і суставы, не нагружаючы іх, прыводзіць цела ў тонус, змагаецца з цэлюлітам і іншае, і іншае. Разавае наведванне басейна будзе каштаваць у сярэднім ад 10 рублёў да 15.50 (у сталічным Палацы воднага спорту), абанемент на 4 наведванні — 50-54 рублі. Зрэшты, сёння часта ў буйных цэнтрах басейн ідзе «ў нагрузку» да іншых відаў трэніровак: вельмі зручна, калі вы маеце вольны час. Жадаеце «па-багатаму» — можна набыць безлімітны абанемент у вялікія цэнтры накшталт сталічнага «Міру фітнесу» — тры паверхі розных зал (ад кардыё і аэробікі да трэнажораў самай рознай скіраванасці) плюс басейн і рознага роду лазні-саўны. Каштаваць, праўда, гэтае задавальненне будзе каля 220 рублёў за месяц, затое такі абанемент мае на ўвазе сістэму «ўсё ўключана», і ў падобным цэнтры цалкам можна, не сумуючы, правесці «ўдваіх са спортам» цэлы выхадны дзень. Плюс у многіх з іх практыкуюцца «гасцявыя дні», калі ўладальнік безлімітнага абанемента можа бясплатна прывесці сябра.

ТРЭНАЖОРНАЯ ЗАЛА

Трэнажорных зал сёння ў Беларусі, мабыць, не менш, чым басейнаў. Ад найбліжэйшага да вашага дому джыма сеткавых фітнес-клубаў, дзе можна набыць абанемент на месяц (дакладней, на 8 заняткаў) рублёў за 70—85, да вялікіх і пафасных шматпавярховых цэнтраў (абанемент будзе каштаваць каля 200 рублёў і вышэй, затое дае мноства самых розных магчымасцяў).

Перакананне, што трэнажорка падыходзіць толькі мужчынам, а жанчын робіць мужчынападобнымі, сёння — перажытак мінулага: ніхто больш так не думае. Трэнажорка падыходзіць усім — і ахвотным знізіць вагу на бегавой дарожцы, і прыхільнікам рэльефнай мускулатуры. Але, зноў жа, тут ёсць нюансы. Напрыклад, такі: калі вы ў трэнажорцы ўпершыню, хоць бы першы занятак (а лепш — некалькі першых заняткаў, пакуль асвоіцеся) варта правесці са спецыялістам, які будзе працаваць з вамі індывідуальна. У гэтым выпадку давядзецца дадаць да кошту знаходжання ў зале (а гэта каля 10—15 рублёў за разавы занятак) яшчэ рублёў 20—25 за паслугі трэнера.

— Пачаткоўцы не валодаюць дастатковай каардынацыяй у рабоце са свабоднымі вагамі, — тлумачыць Мікіта Ушкоў. — Адсутнасць сіметрычнага руху левай і правай паловы цела, страта раўнавагі цела і снарада — тыповыя памылкі навічкоў. Мышцы пакуль не маюць развітой сістэмы нерваў, здольнай у патрэбны час і з патрэбнай інтэнсіўнасцю прапускаць сігнал у вызначаныя мышачныя валокны. Менавіта таму важна рабіць свае першыя крокі ў трэнажорцы пад кіраўніцтвам інструктара.

Калі ігнараваць гэтую параду, магчымыя і траўмы, і стойкая нелюбоў да заняткаў у трэнажорнай зале, зазначае суразмоўнік.

А наогул трэнажорка — гэта «камандны від спорту»: гэта зносіны, новыя знаёмствы, пастаноўка і дасягненне мэты, адзначаюць трэнеры. І свайго роду псіхалагічны трэнінг, які дазваляе стаць больш мэтанакіраваным і сабраным. Так што хоць бы дзеля гэтага варта паспрабаваць.

ТАНЦЫ

Варыянтаў (у тым ліку для дарослых) сёння таксама — хоць адбаўляй. Ад лацінскіх да ўсходніх, ад хіп-хопа да бальных. Калі да 40 або нават 50 гадоў вы так і не навучыліся танцаваць, то, можа, цяпер самы час? Танцы прапрацоўваюць усе групы мышцаў, робяць спіну прамой, а рухі — грацыёзнымі, зніжаюць вагу, і, акрамя таго, сумна на занятках сапраўды не будзе (гэта вам не бег трушком і не манатонны жым ад грудзей).

Асобна спынімся на новым танцавальным фітнес-кірунку. І гэта... балет для дарослых! Кінуць выклік стэрэатыпам і стаць балерынай выкладчыкі рэкамендуюць у любым узросце — нават глыбока «бальзакаўскім». Зразумела, у аматарскім балеце не «ганяюць» вучняў так, як у балеце прафесійным, але папацець усё ж давядзецца — да гэтага трэба быць гатовым. Затое навучэнцы ўжо праз некалькі месяцаў пачынаюць развучваць класічныя балетныя партыі (не самыя складаныя, зразумела). Кірунак у модзе, студыі растуць, як грыбы пасля дажджу. Роскід цэн таксама вялікі. Напрыклад, разавы занятак каштуе ў сярэднім па Мінску ад 13 да 20 рублёў, за 4 заняткі давядзецца выкласці рублёў 55—75. Але першы, выпрабавальны, занятак студыі, як правіла, прапануюць бясплатна. Выкладаюць «балет для ўсіх» прафесійныя артысты, так што пачаткоўцы ў надзейных руках. Хоць на сайтах такіх студый бываюць папярэджанні: маўляў, калі раптам на трэніроўцы стала дрэнна — адразу ж паведаміце педагогу. Яно і зразумела: трэніроўкі, нават «лайтовыя», «для ўсіх ахвотных», у балеце лёгкімі быць не могуць. Затое хуткае зніжэнне вагі сапраўды гарантавана. Плюс жаноцкасць, грацыя і добрая расцяжка.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ АТЛУСЦЕННЕ І ЛІЧБАВЫ АЎТЫЗМ

Як не трапіць у пастку віртуальнай залежнасці?

Здавалася б, шмат інфармацыі — гэта добра. Мы станем больш разумнымі і паспяховымі. Але чамусьці грошай і розуму больш так і не стала, а вось сяброў і жывых зносін прыкметна паменшылася. Навукоўцы ўсё часцей гавораць аб шкодзе тэхналогій, у прыватнасці, лічбавым аўтызме як адным з сур'ёзных сучасных наступстваў павальнай інфарматызацыі. Што гэта за з'ява? Чым і для каго найперш небяспечны лічбавы аўтызм? Чаму найперш пад ударам аказваюцца дзеці? І ці шкодная для дарослых інфармацыя ў вялікай колькасці? Чаму ўсім патрэбны інфармацыйны дэтокс? Пра гэта расказаў нейрахірург, навуковы супрацоўнік аддзялення пухлін галаўнога мозгу РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчык кафедры неўралогіі і нейрахірургіі Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў аховы здароўя Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Гумен ГАРБАННІДЖАД.

— Мы жывём у такі час, калі штодзень атрымліваем вялізную колькасць інфармацыі. Доступ да яе просты — не трэба ісці ў бібліятэку, каб замовіць і ўзяць кнігу, дастаткова зайсці ў інтэрнэт. І, як ні парадаксальна, мы назіраем, што ў людзей па ўсім свеце знікаюцца інтэлектуальныя здольнасці. Мы сустракаемся з такімі з'явамі, як лічбавы аўтызм, лічбавая прыдурказатасць, лічбавы псеўдадэбілізм і інфармацыйнае атлусценне. Нягледзячы на тое што мы маем справу з пашырэннем аб'ёму інфармацыі, размова ідзе пра зніжэнне ўзроўню IQ і інтэлекту.

— Хоць, здавалася б, чым больш мы авалодваем рознымі ведамі, тым больш развіваемся.

— У мінулым гэта было сапраўды так. Возьмем наш рэгіён, Еўропу. Цяпер гэта развіты кантынент, у адрозненні ад таго, якім ён быў у Сярэднявеччы. Тады панаваў рэлігійны светапогляд. Усё было пабудавана на тым, што нельга сумнявацца і трэба верыць. Калі ў цябе ёсць пытанні, звярніся да святара, і той раскажа, што трэба рабіць.

Рэлігійны светапогляд уключаў тры ключавыя моманты: чалавеку дастаткова існуючых ведаў, яму нельга сумнявацца, але ён не дастаткова разумны, каб самастойна вырашыць, што добра, а што дрэнна, таму яму варта звяртацца да крыніцы ведаў — святара, які скажа, як быць у той ці іншай сітуацыі. Чалавеку застаецца шмат маліцца і слухаць, што раіць святар.

У змене светапогляду вялікую ролю сыграла кнігадрукаванне. Распаўсюджанне атрымалі працы філосафаў і іншых мысліцеляў. Філосафы таго часу схіляліся перад чалавечым розумам і яго магутнасцю. Людзі пачалі ўсведамляць, што могуць думаць самастойна, мець уласнае меркаванне і ідэі. Царква пачала губляць свой уплыў, у гарадах сталі ўзнікаць свецкія цэнтры навукі і мастацтва.

Паступова еўрапейцы пачалі падарожнічаць, пашыраліся іх уяўленні аб навакольным свеце. Так у Еўропе пачалася эпоха Адраджэння ці Рэнесансу. У гэты час чалавек вымушаны быў прызнацца, што ён шмат чаго не ведае і павінен думаць. Менавіта ў гэты час многія філосафы прыйшлі да важнай высновы: пакуль чалавек не пачне ўсё ставіць пад сумнеў, ён не дасягне той мэты, якая патрэбна. І гэта вельмі правільны пасыл, бо наш мозг па-іншаму не працуе.

І да цяперашняга часу ў Еўропе дзейнічае секулярны (свецкі) прынцып навучання. Напрыклад, у такіх краінах, як Францыя, школа і рэлігія ідуць паралельна, не перасякаючыся. Навука, крытычнае і лагічнае мысленне — гэта наша левае паўшар'е. За рэлігію, веру і містыку адказвае правае паўшар'е. І адначасова яны працаваць не могуць. У гэтых краінах існуюць і цэрквы, і сінагогі, і мячэці, але ў школе праграма вывучаецца згодна з навуковымі дасягненнямі.

Паступова ўсё, што тармазіла цывілізацыю еўрапейцаў, яны пачалі ўкараняць у свае калоніі: рэлігію, міфы. У выніку Еўропа імкліва развівалася, а іх калоніі тармазілі. Яшчэ ў тыя часы было вядома, што нацыямі, у якіх добра развіта навука, культура і мастацтва, цяжка кіраваць, і каланізаваць іх няпроста. Яны самі імкнуцца вырабляць тавары і прадаваць, а не набываць і завозіць з іншых краін. Як напісаў Фрыдрых Гегель, «незалежнасць ад грамадскага меркавання — першае намаганне ў дасягненні чагосьці вялікага». Варта імкнуцца думаць самастойна, а не даверацца меркаванню большасці.

— І чым большай колькасцю інфармацыі мы валодаем, тым лепшы пры гэтым вынік, ці не так?

— Так, аднак існуе шмат прыёмаў і рэчаў, якія ўплываюць на інтэлект людзей і спосаб іх мыслення. Гэта не выпадковае ўкараненне, а наўмыснае. І самае галоўнае — уплыў на дзіцячы мозг, які развіваецца. У дзяцінстве мозг стварае свае структуры — нейронныя сувязі. І гэта каркас для нашага мыслення цягам усяго жыцця. Калі з дзяцінства каркас выбудаваны няправільна, у далейшым гэты чалавек будзе мець праблемы з крытычным, лагічным мысленнем.

У якасці прыкладу можна прывесці даследаванне, якое правялі ў ЗША яшчэ ў 2000-х гадах — да шырокага распаўсюджання інтэрнэту. Яно паказала, што час, які дзіця праводзіць каля тэлевізара, прама карэліруе з той адукацыяй, якую яно атрымае ў будучым. Дзеці, якія глядзелі тэлевізар менш адной гадзіны ў дзень, амаль у палове выпадкаў атрымалі вышэйшую адукацыю. І толькі 10 % з іх увогуле не атрымалі ніякай адукацыі. А тыя, хто глядзеў тэлевізар больш за тры гадзіны ў дзень, толькі ў 25 % выпадкаў атрымалі хоць нейкую адукацыю, і толькі 10 % з іх змаглі скончыць ВНУ. Тут трэба разумець, што ў сучасным тэлебачанні выкарыстоўваецца шмат прыёмаў, якія ўплываюць на галаўны мозг.

— Як гаджэты ўздзейнічаюць на наш мозг? У чым негатыўны ўплыў?

— У нашым галаўным мозгу ёсць тры цэнтры. Так званы цэнтр выяўлення значнасці, ён адказвае за ўважлівасць; выканальніцкая сетка — гэта спажыванне інфармацыі; дэфолт-сістэма мозгу, яна адказвае за разважанне. Справа ў тым, што яны не могуць працаваць адначасова.

Калі мы атрымліваем інфармацыю, найперш яе ўспрымае цэнтр выяўлення значнасці, а для таго, каб запрацавала дэфолт-сістэма, гэта значыць, каб пераварыць атрыманыя даныя і прыйсці да высновы, патрэбны пэўны час. Гэта не хуткае, а марудная мысленне. Калі дзіця доўгі час занята гаджэтамі, мозг пачынае развівацца па іншым сцэнарыі, які для яго не ўласцівы.

Мы часта бачым, што дзецям даюць гаджэт, каб яны спакойна пасядзелі і бацькі маглі заняцца сваімі справамі. Планшэт ці іншы гаджэт забірае, канцэнтруе ўвагу дзіцяці на гульні, мультфільме. Але ж, каб думаць, мы павінны канцэнтраваць сваю ўвагу на ўласных думках і разважаннях. У дадзенай сітуацыі адбываецца наадварот.

Каб мозг мог правільна развівацца, утвараць нейронныя сувязі і будаваць каркас для магчымасці крытычнага мыслення, дзіця мусіць мацаць, нюхаць, падаць, паднімацца, адчуваць гарачае і халоднае, на вуліцы гуляць у гульні з равеснікамі, крыўдзіцца, злавацца, плакаць, смяяцца — перажываць усю гаму пачуццяў і эмоцый, усё на сваім вопыце паспрабаваць і прайсці. Толькі тады паўнацэнна ствараецца нейронны каркас галаўнога мозгу.

Акрамя таго, трэба памятаць, што IQ развіваецца з 3-4 гадоў да 3-4 класа. І тут важна, каб мозг атрымаў патрэбную трэніроўку, як мышцы, бо пасля яго эластычнасць слабее.

Доктар Джордж Ланд праводзіў даследаванне для НАСА і ставіў мэту паглядзець, як развіваюцца крэатыўнасць, творчыя думкі ў дзяцей. У даследаванні ўдзельнічала 1600 дзяцей. Выявілася, што ва ўзросце ад 4 да 5 гадоў 98 % дзяцей — з амаль ідэальным высокім узроўнем крэатыўнасці. У 10 гадоў ён зніжаецца да 30 %, у 15 — да 12 %, а ў 30 гадоў застаецца толькі 2 % крэатыўнасці. Пры гэтым сама структура галаўнога мозгу не змяняецца. Вучоны прыйшоў да высновы, што гэта адбываецца за кошт «атручвання» мозгу падчас атрымання няправільнай адукацыі.

У цяперашні час да няправільнага падыходу да адукацыі дадаецца ўплыў гаджэтаў, і мы можам казаць пра такую з'яву, як лічбавая прыдурказатасць. Гэта парушэнне мазгавой дзейнасці, якое цягне за сабой зніжэнне ўвагі, канцэнтрацыі, пагаршэнне памяці ў сувязі з частым ці пастаянным выкарыстоўваннем электронных прылад. Лічбавая прыдурказатасць сустракаецца толькі ў дзяцей. Гэта не хвароба, а стан галаўнога мозгу. Ён не лечыцца, і, на жаль, застаецца да канца жыцця.

У дзяцей з лічбавай прыдурказатасцю да канца не развіта крытычнае мысленне, іх мозг можна кантраляваць з дапамогай гаджэтаў. Для гэтага выкарыстоўваюцца розныя тэхналогіі. Ёсць мультфільмы, якія з пункту гледжання дарослых ні пра што, але збіраюць мільёны праглядаў. Дзіця ўпіраецца ў іх вачыма і можа гадзіну глядзець, нічога вакол не заўважаючы.

— Якія тэхналогіі тут выкарыстоўваюцца?

— Камбінацыя святла, падбор колераў, нашаму галаўному мозгу прыемна, калі мы не здагадваемся, якім будзе канец, пачуццё страху ці смех — усе тэхналогіі выкарыстоўваюцца, каб гаджэт мог завалодаць нашай увагай. Што датычыцца колераў, то на першы погляд, напрыклад, аранжавы колер для нас проста аранжавы. Для нашай падсвядомасці гэта колер перамен, бо так заведзена ў прыродзе. Лісце восенню становіцца аранжавым — гэта значыць, што лета скончылася і хутка зіма. Калі сонца на змярканні становіцца аранжавым, значыць, дзень скончыўся і пачынаецца ноч. Гэты колер невыпадкова абіраюць для «каляровых рэвалюцый», бо ў падсвядомасці ён выклікае патрэбныя асацыяцыі. Банкі, якія хочуць асацыіравацца з інавацыйнымі ідэямі, выбіраюць аранжавы ў свае карпаратыўныя колеры.

Камбінацыі колераў, музыка, рух — усё гэта забірае ўсю нашу ўвагу. І пакольскі тры цэнтры ў нашым мозгу не працуюць адначасова, мы атрымліваем інфармацыю, але не паспяваем яе прааналізаваць і зрабіць правільныя высновы. Паколькі імкнемся як мага больш паглынуць інфармацыі, хутка гартаем ленту навін ці сацыяльных сетак, часу на абдумванне і крытычны погляд не застаецца.

— Гэта ўжо характэрна і для дарослых. Чым дарасламу шкодзяць вялікія аб'ёмы інфармацыі, якія мы паглынаем з інтэрнэту, сацсетак і месенджараў?

— Тут мы можам казаць пра такую з'яву, як інфармацыйнае атлусценне. Калі паступае вялікая колькасць інфармацыі, яна, зноў-такі, не апрацоўваецца. Мы можам нават не заўважаць часу — здаецца, пасядзелі ў інтэрнэце гадзіну, а прайшло тры.

Каб лабараторная мыш ужывала наркотыкі, яе трэба пасадзіць у клетку. Яна будзе націскаць на педаль і атрымліваць наркотык. Калі яе выпусціць з клеткі, яна не будзе націскаць на педаль — у яе тысяча іншых задавальненняў, каб заняць сябе. Наш мозг мае іншую ўласцівасць: нягледзячы на тое што ў нас шмат задавальненняў — спорт, турызм, бібліятэка, танцы, мы ўсё роўна будзем сядзець у інтэрнэце замест таго, каб выйсці на вуліцу.

Атрымліваючы вялікую колькасць інфармацыі, мы лічым сябе экспертамі ва ўсіх пытаннях. Для таго каб спячы торт «Напалеон», дастаткова паглядзець рэцэпт у інтэрнэце. Магчыма, не атрымаецца, як у шэф-кухара, але ўсё роўна мы лічым сябе профі. Гэтак жа можна паглядзець у інтэрнэце, што рабіць, калі баліць галава. Вось парады па першай спасылцы: прыняць абязбольвальнае, папіць вады, знайсці халоднае цёмнае месца, выкарыстаць халодны кампрэс, памасіраваць. І чалавек лічыць, што ў яго дастаткова навыкаў, каб вылечыць галаўны боль. Калі ж ён звернецца да ўрача, той можа западозрыць высокі ціск, прастуду, павелічэнне ўнутрывочнага ціску, пухліну ў галаўным мозгу і іншыя паталогіі.

Лічбавае атлусценне дае нам ілюзію ведання. І пад яе ўплывам мы пішам каментарыі пад тым, як гатаваць торт, як лячыць галаўны боль, пра запуск шатла, — мы з'яўляемся экспертамі ва ўсіх пытаннях, ад палітыкі да медыцыны. Ілюзія ведання таксама ўплывае на далейшае лагічнае і крэатыўнае мысленне — навошта думаць і сумнявацца, калі мы і так усё ведаем ці можам паглядзець у інтэрнэце. А інфармацыю, якую знаходзім у сеціве, мы не заўсёды падвяргаем крытыцы.

Але паўтаруся, што найбольш небяспечна гэта для дзяцей і падлеткаў, бо мозг прызвычайваецца менавіта такім чынам, праз гаджэты, атрымліваць інфармацыю.

Ёсць і крайняя ступень інфармацыйнага атлусцення — інфармацыйны псеўдадэбілізм, гэта псіхічнае растройства, характэрнае для дарослых. Пры ім чалавек праяўляе прыкметы прыдурказатасці праз надзвычайнае ўжыванне інфармацыі, што вядзе да моцнага спынення крытычнага мыслення, рассеянасці, пагаршэння памяці і ўвагі і нізкага ўзроўню самакантролю. У адрозненні ад лічбавага аўтызму ў дзяцей, які лічыцца невылечным, лічбавая псеўдапрыдурказатасць карэктуецца, і ў псіхолагаў ёсць свае методыкі, каб лячыць такіх людзей.

— Як не стаць ахвярай празмернай колькасці інфармацыі?

— Рабіць інфармацыйны дэтокс — не карыстацца нейкі час тэлефонам, абмяжоўваць сядзенне ў сацыяльных сетках і больш разважаць, чытаць кнігі, займацца спортам замест прагляду карцінак і відэа. Гэта няпроста зрабіць. Кожны з нас, калі прачынаецца, залазіць у тэлефон — праверыць пошту, паглядзець надвор'е, зайсці ў сацсеткі. Здаецца, хочам атрымаць мінімальную інфармацыю, а часта гэта зацягваецца.

Цяпер, у час глабалізацыі, правесці прафілактыку лічбавага аўтызму — гэта яшчэ і пытанне нацыянальнай бяспекі ўсіх краін, каб моладзь менш падвяргалася шкоднаму ўздзеянню, бо гэта наша будучыня, і каб дарослыя людзі ўсведамлялі, якія небяспекі можа несці павальная інфарматызацыя.

Алена КРАВЕЦ.

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор аукциона)
извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Дорстройиндустрия»**

Аукцион состоится **26.12.2023 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Лот № 1: Грузопассажирский комби PEUGEOT PARTNER,

кузов (рама) № VF3GJWJB8J081375.
Начальная цена с НДС 20 % – 8 000,00 руб.
Задаток – 1 000,00 руб.

Лот № 2: Легковой хэтчбек SKODA OCTAVIA,

кузов (рама) № TMBBD41Z072061963.
Начальная цена с НДС 20 % – 15 600,00 руб.
Задаток – 1 800,00 руб.

Место нахождения Лотов №№ 1–2:
Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 19.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – ino.by. Шаг аукциона – 5 %.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатков – **22.12.2023 в 11.00.**

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

БРЕСТСКИЙ ФИЛИАЛ
РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

Извещает о снятии Лота № 1
с аукциона по продаже имущества
ОАО «Селекционно-гибридный центр «Западный», назначенного на 05.12.2023

Телефоны для справок: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02
Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

Извещение о продаже имущества ОАО «Селекционно-гибридный центр «Западный» опубликовано в газете «Звязда» от 01.11.2023

УНП 201028245

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению **Лоевского РайПО** (продавец) извещает о проведении **6 декабря 2023 года** повторного открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

Лот № 2: автомобиль ZAZ SENS, год выпуска 2010, рег. № АЕ 8150-3, кузов (рама) № Y6DTF55Y0A0001961, расположенный по адресу: Гомельская область, Лоевский район, г. п. Лоев, ул. Батова, 59

Начальная цена продажи без НДС **– 2 400,00** бел. руб. без НДС.
Задаток 1 % – 24,00 бел. руб.

Продавец: Лоевское районное потребительское общество, Гомельская область, г.п. Лоев, ул. Батова, 59.
Конт. тел.: +375 44 717-81-55, +375 29 345-09-66.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 05.12.2023 г. в 17.00.

Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения. Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем, будет учтен в счет окончательной стоимости предмета оценки. Указанные объекты никому другому не проданы, не заложены, под запретом не состоят, судебного спора о них не имеется, других владельцев нет. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Конт. тел. организатора аукциона:
+375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62

ОАО «Дзержинский экспериментально-механический завод»
ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

№ Лота	Наименование	Место нахождение	Начальная цена с НДС, руб. РБ	Сумма задатка (10 % от первоначальной цены) с НДС, руб. РБ
1	**Грузовой специальный автомобиль «МАЗ 5337», автокран,** идентификационный номер VIN – Y3V53370270009197, регистрационный номер АВ 8584-5, 2007 г. в., цвет – белый	Минская обл., г. Дзержинск, ул. Фоминых, 46	34 571 руб. 20 коп.	3 457 руб. 12 коп.

Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/счет BY62AKBB30120606040036000000, БИК AKBBBY2X, ЦБУ № 606 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, УНП 600004946.

Аукцион состоится **27 декабря 2023 г. в 10.00** по адресу: Минская обл., г. Дзержинск, ул. Фоминых, 46. Заявление на участие и необходимые документы принимаются **по 26 декабря 2023 г. 16.00** по указанному адресу.

Для участия в аукционе претенденты представляют: заявление (в произвольной форме); копию платежного поручения с отметкой банка, подтверждающего внесение суммы задатка для участия в аукционе на расчетный счет, указанный в извещении; физические лица – паспорт, представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписанные документы (руководитель – копию документа о назначении на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе), документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица счета необходимо его открыть.

Контактные телефоны: +375 44 554-45-26, +375 44 554 44 86.

27 декабря 2023 г. **№ 11-Н/2023**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ
по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с продажей права аренды земельного участка в г. Гомеле

№ лота	Наименование объекта/ адрес земельного участка: г. Гомель	Целевое назначение/ срок аренды	Кадастровый номер, площадь земельного участка	Начальная стоимость, руб.	Сумма задатка, руб.	Расходы на подготовку док-ции, руб.	Наличие ограничений, обременений
1	Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-612 (по генплану), ул. Кузнечная, 57	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ аренда сроком по 15 ноября 2122 года	340100000008003822, 0,0840 га	10 503,78	1 995,72	Ориентировочно 4 500,00	Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, зона санитарной охраны водопроводных сооружений, обременения в связи с размещением на земельном участке не завершенного строительством здания жилого дома, строительного мусора, частично располагается фундамент капитального ограждения смежного землепользователя по ул. Кузнечной, 47
2	Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-2281 (по генплану), ул. Нарочанская, 36	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ аренда сроком по 15 ноября 2122 года	340100000008004069, 0,0937 га	12 890,16	2 449,13	Ориентировочно 4 500,00	Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, охранная зона линий, сооружений электросвязи и радиофикации, зона санитарной охраны водопроводных сооружений, охранная зона объектов газораспределительной системы, обременения в связи с размещением на земельном участке не завершенного строительством здания одноквартирного жилого дома
